ЛіМ

# Літаратура і мастацтва

Газета творчай інтэлігенцыі Беларусі

№ 14 (5171) 8 красавіка 2022 г.

ISSN 0024-4686

16+

*Мастацкая інтуіцыя даследчыка стар. 5*

*Жыццё пад крыллем заранiц стар. 11*

*Час патрабуе крэатыву стар. 12*

# З верай, надзеяй, любоўю



*Абраз Маці Божай Бялыніцкай, сярэдзіна XVII ст.*

Наўпрост у душу глядзіць з абраза Маці Божая Бялыніцкая... Позірк яе праніклівых вачэй зусім не строгі, не асуджальны. Наадварот, у ім — такая бязмежная дабрыня і ўсёдаравальнасць, што, як бы кепска табе ні было, пачынаеш дзесьці краем свядомасці разумець: безвыходнасці няма, і пакуль жывеш, трэба верыць, а з верай усё па плячы…

Колькі слёз, просьбаў, падзяк пабачыў і пачуў гэты абраз больш чым за тры з паловай стагоддзі! З ім звязаны цудадзейныя ацаленні і выратаванні, неверагодныя легенды і гісторыі. Спіс, зроблены з унікальнай іконы, якая захоўвалася ў Бялынічах, а потым у Магілёве, цяпер знаходзіцца ў Музеі старажытнабеларускай культуры Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Нядаўна абраз сярод іншых, што лічацца цудадзейнымі, выстаўляўся ў Вялікім тэатры оперы і балета. Для гледачоў было падвойнае свята: перад паказам «Сівой легенды» яны мелі магчымасць дакрануцца душой да сакральнага айчыннага мастацтва, напоўніць яе святлом горніх вышыняў, успомніць, што ўсё — часова, і толькі Любоў мае значэнне, бо яна — вечная. Чым кіраваліся стваральнікі аднадзённай выстаўкі?

Дырэктар музея і адзін з арганізатараў выстаўкі Барыс Лазука падзяліўся меркаваннямі з карэспандэнтам «ЛіМа»: «Многае ў гэтым свеце мы не ведаем. Але ў наш няпросты час лепш думаць пра добрае. Без слоў пастаяць перад выявамі Боскай Маці і яе дзіцятка Хрыста, згадаць блізкіх, дарагіх людзей з любоўю, надзеяй і верай — бо што без гэтага чалавек?»

**Матэрыял пра Музей старажытнабеларускай культуры чытайце ў наступным нумары**

## «ЛіМ»-акцэнты

**Конкурсы.** Міністэрства інфармацыі аб'явіла аб старце прыёму заявак на нацыянальны конкурс «Залатая Літара».Спаборніцтва праводзіцца для рэспубліканскіх друкаваных СМІ, інфармагенцтваў, сеткавых выданняў па намінацыях: «Найлепшыя матэрыялы грамадска-палітычнай тэматыкі», «Найлепшыя матэрыялы сацыяльна-эканамічнай тэматыкі», «Найлепшыя матэрыялы па тэматыцы спорту і турызму», «Найлепшыя матэрыялы культуралагічнай, гісторыка-краязнаўчай тэматыкі», «Найлепшыя матэрыялы маладзёжнай, дзіцяча-юнацкай тэматыкі», «Найлепшы інтэрнэт-праект рэдакцыі СМІ і сеткавага выдання». Падаць заяўкі можна і па персанальных намінацыях: «Найлепшы рэпарцёр рэспубліканскіх друкаваных СМІ, інфармагенцтваў, сеткавых выданняў», «Найлепшы рэпарцёр абласных, раённых, гарадскіх, карпаратыўных друкаваных СМІ, інфармацыйных агенцтваў, сеткавых выданняў», «Найлепшы фотакарэспандэнт рэспубліканскіх друкаваных СМІ, інфармацыйных агенцтваў, сеткавых выданняў», «Найлепшы фотакарэспандэнт абласных, раённых, гарадскіх, карпаратыўных друкаваных СМІ, інфармацыйных агенцтваў, сеткавых выданняў», «Найлепшы аналітычны матэрыял». Гран-пры будзе ўручаны за найлепшы творчы праект года рэспубліканскіх друкаваных СМІ, інфармацыйных агенцтваў, сеткавых выданняў і найлепшы творчы праект года абласных, раённых, гарадскіх, карпаратыўных друкаваных СМІ, інфармацыйных агенцтваў, сеткавых выданняў. Будзе вызначаны таксама ўладальнік спецыяльнага прыза «За ўклад у журналістыку». Заяўкі прымаюцца да 15 красавіка 2022 года (уключна) на адрас: 220004, г. Мінск, пр. Пераможцаў, 11, кабінет 425 з пазнакай «на нацыянальны конкурс "Залатая Літара"».

**Канферэнцыі.** У Нацыянальным мастацкім музеі Беларусі 26 мая пройдзе Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя «Аладаўскія чытанні — 2022», прысвечаная 100-годдзю з дня нараджэння народнага мастака Беларусі Міхаіла Савіцкага, паведамілі БелТА ва ўстанове. На канферэнцыі прапануецца абмеркаваць творчаскую спадчыну народнага мастака Беларусі Міхаіла Савіцкага ў кантэксце культуры і мастацтва XX—XXI стагоддзяў; актуальныя тэндэнцыі ў галіне сучаснага выяўленчага мастацтва; атрыбуцыю і навуковыя даследаванні твораў мастацтва з музейных калекцый; практычны досвед і гістарычную перспектыву рэстаўрацыі музейных прадметаў; сучасныя магчымасці музейнай камунікацыі, тэорыю і практыку музейнага менеджменту і маркетынгу, інклюзію ў музейнай сферы. «Да ўдзелу ў канферэнцыі запрашаюцца мастацтвазнаўцы, музеязнаўцы, рэстаўратары, гісторыкі, культуролагі і прадстаўнікі сумежных дысцыплін, якія разглядаюць магчымасць інфармаваць грамадскасць аб сваіх прафесійных напрацоўках», — адзначылі арганізатары.

**Стажыроўка.** У Мінску стартавала творчая стажыроўка кіраўнікоў аматарскіх калектываў мастацкай творчасці і грамадскіх арганізацый беларусаў замежжа. «Такія стажыроўкі праходзяць з 2016 года ў межах дзяржаўнай праграмы "Культура Беларусі", — адзначыла дырэктар Рэспубліканскага цэнтра нацыянальных культур Вольга Антоненка. — Мы запрашаем беларусаў замежжа з розных краін свету. Гэта і старшыні грамадскіх аб'яднанняў, і кіраўнікі творчых калектываў. Яны прыехалі да нас, каб насыціцца беларускасцю. Падчас занягкаў мы выкладаем беларускі вакал, харэаграфію, дэкаратыўна-прыкладное мастацтва, ладзім майстар-класы па правядзенні абрадавых свят. Сёлетняя сустрэча сабрала прадстаўнікоў з дзевяці краін, сярод якіх — Аргенціна, Іарданія, Арменія, Расія». Стажыроўка стартавала ў музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны невыпадкова. Наведванне гэтага месца задае магутны старт усяму мерапрыемству, падчас якога чырвонай ніткай праходзіць тэма Года гістарычнай памяці.

**Алімпіяда.** Рэспубліканская алімпіяда па гісторыі для старшакласнікаў пройдзе ў Беларускім дзяржаўным універсітэце. Для ўдзелу запрашаюцца вучні 8—11 класаў школ, гімназій і ліцэяў з усіх рэгіёнаў краіны. Зарэгістравацца можна да 17 красавіка. Алімпіяда складаецца з двух этапаў. Першы тур пройдзе 22 красавіка ў анлайн-фармаце на адукацыйным партале БДУ. Навучэнцам прапануюць выканаць тэставае заданне па вучэбных прадметах «Гісторыя Беларусі» і «Сусветная гісторыя», якое ахопліве перыяд са старажытных часоў і да нашага часу. Фінал адбудзецца 6 мая на гістарычным факультэце. Удзельнікі выканаюць інтэрактыўныя заданні, складзеныя выкладчыкамі ўніверсітэта. Пераможцаў узнагародзяць каштоўнымі прызамі, дыпломамі і сувенірамі.

**Традыцыі.** Выстаўка «Гісторыя посуду: эпоха і стыль» адкрыецца сёння ў музеі этнаграфіі Магілёва. У экспазіцыі прадстаўлена больш за чатыраста арыгінальных артэфактаў XVII — пачатку XXI стагоддзяў, якія расказваюць пра гісторыю стварэння посуду, яго эвалюцыю — ад глінянага гаршка да вытанчаных фарфоравых форм. «Посуд з'яўляецца адным з самых любімых аб'ектаў калекцыяніравання. Такія калекцыі даюць магчымасць прасачыць гісторыю культуры, змену стыляў. Яны прываблююць разнастайнасцю сваіх форм і фарбаў, майстэрствам, прыгажосцю і арыгінальнасцю выканання», — расказалі ў музеі. Экспазіцыя знаёміць наведвальнікаў з цікавымі ўзорамі ганчарнага майстэрства XVII—XX стагоддзяў, рускага і заходнееўрапейскага фарфору і фаянсу сярэдзіны XIX — пачатку XX стагоддзя, савецкага фарфору 1930—1990-х гадоў, металічнага і шклянога посуду, сталовых прыбораў.

**Агляд афіцыйных падзей ад Раісы МАРЧУК**

---

конкурсы

# Калейдаскоп талентаў

**У Доме дружбы адбылося вялікае свята — урачыстае падвядзенне вынікаў літаратурнага конкурсу «Славянскі калейдаскоп», прысвечанага Дню яднання народаў Беларусі і Расіі. Арганізатарамі выступілі Мінскае гарадское аддзяленне СПБ, таварыства дружбы «Беларусь — Расія» і культурна-асветніцкае грамадскае аб'яднанне «Наша Русь». Дзявятае па ліку творчае спаборніцтва было прымеркавана да Года гістарычнай памяці.**

На конкурс паступіла больш за 230 твораў паэзіі, прозы і публіцыстыкі ад аўтараў ва ўзросце ад 15 да 35 гадоў з Мінска, розных рэгіёнаў Беларусі, Расіі, а таксама з Рыгі, Данецка і Луганска. Пастаянным старшынёю творчага журы з'яўляецца кіраўнік Мінскага гарадскога аддзялення СПБ, старшыня таварыства дружбы «Беларусь — Расія» Міхась Пазнякоў.

У намінацыі «Паэзія» ва ўзроставай катэгорыі 15—20 гадоў перамогу атрымалі: Дзіяна Вірынская (г. Брэст), Міхайліна Хвясюк (г. Мікашэвічы), Валянціна Вандзіч (Столінскі р-н, в. Маньковічы); ва ўзроставай катэгорыі 21—27 гадоў: Юрый Мартыненка (г. Луганск), Маргарыта Пыка (г. Мінск), Мікіта Валько (г. Гродна), Алеся Сярогава (г. Мінск), Святлана Прымака (г. Мінск); ва ўзроставай катэгорыі 28—35 гадоў: Юлія Піліпёнак (г. Навапалацк), Алеся Каблукова (г. Мінск), Яна Гільмуліна (г. Полацк).

У намінацыі «Проза» ва ўзроставай катэгорыі 15—20 гадоў перамаглі: Ганна Кершыс (г. Мінск), Ульяна Дастанка (Любанскі р-н, в. Рэдкавічы), Радзівон Алісейчык (аг. Лясны, Мінскі р-н), Ксенія Лінічэнка (г. Орша); ва ўзроставай катэгорыі 21—27 гадоў: Вікторыя Чаркасава (г. Кумертаў, Расія), Макар Пашкевіч (г. Гродна), Анастасія Верына (г. Фаніпаль). Ва ўзроставай катэгорыі 28—35 гадоў: Аляксандр Філей (г. Рыга, Латвія), Андрэй Папоў (г. Мінск), Ларыса Іванова (Горацкі р-н, аг. Добрая), Маргарыта Змітровіч і Юлія Піліпёнак (г. Навапалацк).

У намінацыі «Публіцыстыка» лаўрэатамі сталі: Алеся Парэчына, Кацярына Гузава, Кацярына Лук'янава, Анастасія Суворава, Арсеній Красілевіч, Дар'я Музыка, Лізавета Пегерава (усе — г. Мінск), Ксенія Ніжнікава (г. Гомель), Глеб Барздоў (г. Шклоў), Анастасія Ленская (Любанскі р-н, в. Атраднае). Усе — ва ўзросце ад 15 да 21 года.

Пераможцы конкурсу атрымалі дыпломы, сувеніры і кнігі з аўтографамі аўтараў.

Найлепшыя творы лаўрэатаў конкурсу прапанаваны літаратурна-мастацкім выданням.

**Павел КУЗЬМІЧ**

---

у Саюзе пісьменнікаў Беларусі

# Прыступка да прафесіяналізму

**Больш як дзесяць гадоў у Гомелі па ініцыятыве членаў абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі працуе гуртковa-пазакласнае фарміраванне — школа-студыя «Малады літаратар». Днямі з пачаткоўцамі ў абласной універсальнай бібліятэцы імя У. І. Леніна сустрэўся кіраўнік рэгіянальнай творчай суполкі Уладзімір Гаўрыловіч.**

Тэма сустрэчы, як адзначыў госць, — больш актыўнае ўзаемадзеянне членаў аматарскага калектыву з прафесійнымі аўтарамі і сумесная праца па рэалізацыі мерапрыемстваў, прымеркаваных да Года гістарычнай памяці, 140-годдзя Янкі Купалы і Якуба Коласа.

— Абласная пісьменніцкая арганізацыя актыўна працуе з творчай моладдзю і ўсімі аўтарамі, якія спрабуюць заявіць пра сябе ў творчасці, — адзначыў Уладзімір Гаўрыловіч. — Каб выявіць і падтрымаць пачаткоўца, штогод праводзіцца шэраг абласных і міжраённых творчых конкурсаў для прадстаўнікоў розных узроставых груп і прафесій. Іх вынік — Форум маладых літаратараў і аматараў мастацкай творчасці, які праводзіцца штогод пісьменніцкай арганізацыяй. Такіх форумаў прайшло ўжо пяць. Лаўрэаты і фіналісты запрашаюцца на майстар-класы, атрымліваюць кансультацыі, ладзяцца разборы мастацкіх твораў, дасланых на конкурсы. А праводзяць усё гэта вопытныя пісьменнікі, майстры слова. Калі ж у пачаткоўца ёсць здольнасці, цярпенне і жаданне працаваць у жанрах паэзіі ці прозы, то іх найлепшыя творы прапануюцца для размяшчэння ў выданнях аддзялення. Маладыя аўтары, якія наведваюць як гэтую студыю, так і іншыя аматарскія літаратурныя аб'яднанні пры ўстановах адукацыі і культуры, многія з якіх узначальваюць пісьменнікі аддзялення, вылучаюцца да ўдзелу ў рэспубліканскіх і міжнародных творчых конкурсах і перамагаюць. У 2019 годзе абласная пісьменніцкая арганізацыя наладзіла нават першы злёт аматарскіх аб'яднанняў Беларусі, Расіі і Украіны, у якім бралі ўдзел 12 каманд. Такая праца будзе і надалей прадоўжана.

Кіраўнік пісьменніцкай суполкі прыйшоў на сустрэчу з пачаткоўцамі не з пустымі рукамі: уручыў пераможцам розных гадоў Фестывалю рускай паэзіі ў Рэспубліцы Беларусь «Сугучча слоў жывых» альманах гэтага форуму з творамі маладых аўтараў, які толькі што выйшаў з друку. Сёлета 1-е месца ў гэтым конкурсе заняла Аліна Рыцік, у мінулыя гады пераможцамі станавіліся маладыя аўтары Іван Краўцоў і Фёдар Бусел. Гэта адна з прыступак да прафесіяналізму, якіх у моладзі будзе яшчэ шмат.

Старшыня абласнога аддзялення СПБ агучыў планы пісьменніцкай арганізацыі на бягучы год. У прыватнасці, запрасіў пачаткоўцаў удзельнічаць у новых конкурсах і акцыях, у літаратурных фестывалях і «пашукаць шчасця» ў конкурсе рукапісаў на саісканне абласной прэміі імя Кірылы Тураўскага.

Уладзімір Гаўрыловіч, а таксама прысутныя на сустрэчы пісьменнікі Тамара Кручэнка, Лідзія Долбікава, Алег Ананьеў і Наталля Шэмяткова адказалі на шматлікія пытанні. Маладыя аўтары і пісьменнікі — дамовіліся разам да восені падрыхтаваць вечарыну «Калейдаскоп славянскага гумару» (па выніках першага конкурсу сатырычнай і іранічнай прозы і паэзіі імя В. Ю.Ткачова).

**Уладзімір ПРЫАЗЁРНЫ**

---

стасункі

# Дэбютантам — яркі старт

**Рэспубліканскае грамадскае аб'яднанне «Рускае таварыства» ў выдавецтве «Альтэрнатыва» пры падтрымцы Расійскага цэнтра навукі і культуры ў Брэсце выдала альманах «Сугучча слоў жывых — 2021», у якім прадстаўлены вершы пераможцаў чатырох рэспубліканскіх конкурсаў маладых паэтаў.**




Кніга ўяўляе сабой своеасаблівы летапіс фестывальнага жыцця, дзе ёсць месца гісторыі паэтычнага свята, апавядам пра асабістыя набыткі і адкрыцці, незабыўныя сустрэчы. Пажаданні ўдзельнікам, шчырыя водгукі, памятныя фатаграфіі і, вядома ж, паэзія як старонкі Памяці… З глыбінным спасціжэннем слова прыходзяць арыгінальныя вобразы, нечаканыя рыфмы, а галоўнае — разуменне неабходнасці духоўнага адзінства розных пакаленняў, працягу традыцый класікаў.

— Паэтычны фестываль — гэта яднанне аднадумцаў, усіх тых, для каго літаратура не проста творчасць, а цэлы свет узаемаадносін, супярэчнасцей, імкненняў і бясконцага руху наперад — насустрач жыццю, насустрач прыгажаму, — дзеляцца ўражаннямі на старонках выдання арганізатары фэсту Сяргей Моладаў і Любоў Красеўская. — Досвед дзевяці фестываляў рускай паэзіі ў Беларусі паказаў, як шмат таленавітай моладзі бярэ ўдзел у конкурсе. Прыязджаюць вядомыя літаратары з Беларусі і Расіі, праводзяць майстар-класы для маладых паэтаў, разам з імі наведваюць мемарыяльны комплекс «Брэсцкая крэпасць-герой».

Усяго два фестывальныя дні раз на два гады, але на больш чым двух сотнях друкаваных старонак мы бачым, якая вялікая, бесперапынная падрыхтоўка папярэднічала памятным сустрэчам. У аддзяленнях Саюза пісьменнікаў Беларусі вядзецца актыўная работа з маладымі паэтамі, будучымі фіналістамі конкурсу. А яшчэ альманах стаў цудоўнай магчымасцю для ўдзельнікаў не развітвацца з атмасферай казачнай краіны Паэзіі, новымі і старымі сябрамі. Кніга паказвае падрастаючым паэтам шлях у новую прастору, абяцае дэбютантам яркія старты!

**Таццяна ДЗЕМІДОВІЧ**

літаратурнае братэрства

# Прывітанне ў Дагестан, нагайцам — ад беларусаў

**Званнем «Народны паэт Рэспублікі Дагестан» адзначаны добры сябра беларускай літаратуры — сакратар, кіраўнік нагайскай секцыі Саюза пісьменнікаў Рэспублікі Дагестан паэт, празаік, публіцыст, перакладчык Анварбек Култаеў.**


Анварбек Култаеў.

У айчынных выданнях у перакладзе на беларускую і рускую мовы друкаваліся творы Анварбека Култаева. Сярод тых, хто пераўвасабляў паэзію дагестанскага сябра на мову Купалы і Коласа, — лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь Мікола Мятліцкі. У інтэрв'ю беларускім медыя нагайскі мастак слова заўважаў: «У савецкія гады на нагайскім радыё я вёў рэгулярную перадачу "Дружба народаў — дружба літаратур". Імкнуўся паказаць усю палітру нацыянальных літаратур. І Расійскай Федэрацыі, і іншых савецкіх рэспублік. Чытаў у эфіры вершы ў перакладзе на нагайскую і рускую мовы, зразумела, і свае пераклады…» Заўсёды ў полі зроку Анварбека Култаева — і беларуская літаратура.

— Сёлета — год юбілеяў народных песняроў Беларусі Янкі Купалы і Якуба Коласа, — сказаў ужо зараз у час віншавання яго са званнем народнага паэта спадар Култаеў. — І гэтая падзея — самая што ні ёсць нагода для ўзнаўлення шырокіх абсягаў нашых літаратурных сувязей. Спадзяюся на новыя нагайскія публікацыі пра Коласа і Купалу, у тым ліку і ў масавых, грамадска-палітычных выданнях на нагайскай мове. Спадзяюся на новыя пераклады твораў класікаў беларускай літаратуры. Ды і не толькі пра Купалу і Коласа трэба ўзнавіць уяўленні новых пакаленняў нагайцаў. Але і пра Максіма Багдановіча, Уладзіміра Караткевіча… Чаму б праз пераклады не распавесці юным чытачам пра Янку Маўра, Васіля Вітку, Алеся Якімовіча, Эдзі Агняцвет?! Думаецца, што тая дабрыня, шчырасць, якімі багатыя творы беларускіх пісьменнікаў, стануць сапраўднымі ўрокамі дружбы, добрасуседства народаў Беларусі і Расійскай Федэрацыі.

І яшчэ — з інтэрв'ю Анварбека Култаева беларускаму медыйнаму рэсурсу: «Маё меркаванне такое: кожны народ павінен ведаць класікаў літаратуры другіх народаў. Хаця б суседніх, блізкіх… Дружба мацней з нічога не становіцца».

**Кастусь ХАДЫКА**

памяць

# Кніга жыцця паэта

**Пісьменнікі нават пасля смерці працягваюць жыць у сваіх творах. Пацвярджэнне гэтаму — і літаратурная вечарына, прысвечаная памяці Міколы Мятліцкага, што прайшла ў Доме дружбы і была прымеркавана да дня нараджэння вядомага паэта.**

Месца правядзення выбрана невыпадкова: Мікалай Міхайлавіч прымаў актыўны ўдзел у дзейнасці Беларускага таварыства дружбы і культурнай сувязі з замежнымі краінамі, быў ініцыятарам многіх мерапрыемстваў, якія тут праводзіліся, узначальваў арганізацыю «Беларусь — Славакія». Пра гэтыя стасункі, чалавечыя якасці і паэзію Міколы Мятліцкага, прасякнутую любоўю да роднага краю, расказала, адкрываючы сустрэчу, старшыня грамадскага аб'яднання Ніна Іванова.

Ушанаваць памяць паэта прыйшлі яго родныя, сябры і калегі па пяры. Міхась Пазнякоў, Яўген Хвалей, Вадзім Спрынчан, Алесь Бараноўскі, Навум Гальпяровіч, Зіновій Прыгодзіч падзяліліся сваімі ўспамінамі, прыгадалі сумесныя паездкі на радзіму творцы — вёску Бабчын, якая пасля чарнобыльскай катастрофы знаходзіцца ў зоне адчужэння, і, канечне ж, чыталі яго вершы.

Фота Кастуся Дробава.


Слова мае Міхась Пазнякоў.

Прагучала паэзія Міколы Мятліцкага і ў выкананні выхаванцаў тэатра-студыі «Акцёр», а таксама студэнтаў вышэйшых навучальных устаноў.

**Алесь ЦІМАФЕЕЎ**

фестывалі

# Ад сэрца да сэрца

**Зрабіць сваімі рукамі падарунак роднаму чалавеку, пабываць на разнастайных майстар-класах, паглядзець добры фільм, наведаць разам з дзецьмі спектаклі, пакаштаваць смачныя стравы ў манастырскай трапезнай запрашае фестываль «Радасць», што сёння распачаў працу ў Палацы мастацтваў.**

Традыцыйна фестываль праходзіць у атмасферы цеплыні і спагады. Праграма яго разлічана на шырокае кола наведвальнікаў рознага ўзросту: кожны ў тэматычнай разнастайнасці знойдзе тое, што яму блізка і цікава. Галоўны пасыл фестывалю — перамога любові над цёмнымі сіламі, каштоўнасць сям'і, прыгажосць і велічнасць вечнасці.

Працуе на фестывалі і кірмаш, дзе манастыры, храмы і рамеснікі з розных краін прапануюць свае вырабы і сувеніры ручной работы, аўтарскую кераміку, натуральную касметыку і тавары для здароўя, а таксама каштоўныя рэчы: рэдкія кнігі, абразкі.

Малодшым дзеткам зазвычай найбольш цікава паглядзець лялечны тэатр-батлейку, што мае старажытныя традыцыі, і наведаць кантактны заапарк. Уваход на ўсе мерапрыемствы бясплатны.

Сродкі, сабраныя на дабрачынны акцыі ў межах фестывалю, пойдуць на дапамогу Пяршайскай бальніцы Валожынскага раёна, дзе пад доглядам сясцёр міласэрнасці і медсясцёр жывуць цяжкахворыя людзі.

**Аліса БРАТКА**

імпрэзы

# Дзеля паглыблення інтэграцыі

**Круглы стол «Братэрства народаў: Беларусь і Расія», прымеркаваны да Дня яднання народаў дзвюх краін, адбыўся ў Лідскай раённай бібліятэцы імя Янкі Купалы.**

Вядучыя імпрэзы адзначылі, што ў беларусаў і расіян шмат агульнага. Нашы землі аб'ядноўваюць шматвяковыя культурныя, духоўныя і гістарычныя сувязі. Дзвюма краінамі створаны надзейны эканамічны фундамент у межах Саюзнай дзяржавы. Усё гэта садзейнічае паглыбленню інтэграцыі і пашырэнню гістарычных перспектыў як Беларусі, так і Расіі.

За круглым сталом размова ішла пра развіццё міждзяржаўных адносін дзвюх шматнацыянальных краін, культурныя традыцыі, якія заўсёды спрыялі развіццю сяброўскіх адносін паміж Рэспублікай Беларусь і Расійскай Федэрацыяй. Асобна спыніліся на рэалізацыі маладзёжных праектаў Саюзнай дзяржавы. Навучэнцы Лідскага каледжа падзяліліся думкамі аб тым, якія магчымасці для развіцця Расіі і Беларусі прадстаўляе супрацоўніцтва ў фармацэ Саюзнай дзяржавы.

Кніжная выстаўка «Права быць разам» нагадала прысутным, наколькі цесныя і непарыўныя сувязі ў нашых народаў, бо карані многіх вядомых у Расіі навукоўцаў, літаратараў, палітычных дзеячаў звязаны з Беларуссю і, наадварот, шмат ураджэнцаў Расіі жывуць, працуюць памнажаюць свае дасягненні ў Беларусі.

**Дар'я МАРЦІНКЕВІЧ**

«ЛіМ»-люстэрка

Дні беларускага кіно прайшлі ў Рэспубліцы Таджыкістан. Такая інфармацыя размешчана на сайце Нацыянальнай кінастудыі «Беларусьфільм». Таджыкскаму гледачу паказалі анімацыйную стужку «Зоркі сёмага неба», фільм для сямейнага прагляду «Кіндэрвілейскі прывід», ваенныя карціны «Лёс дыверсанта» і «Вайна. Застацца чалавекам» (альманах з 4 навел), а таксама гістарычны прыгодніцкі фільм «Авантуры Прancіша Вырвіча». Прадстаўнікамі беларускай дэлегацыі ў Душанбэ выступілі генеральны дырэктар «Беларусьфільма» Уладзімір Карачэўскі і рэжысёр Алена Турава.

Персанальная выстаўка арт-квілта расійскай мастачкі Ірыны Варонінай адкрылася ў Гарадской мастацкай галерэі твораў Леаніда Шчамялёва ў рамках IV Міжнароднага фестывалю «ТэкСтыльны букет». У экспазіцыі «Нітка. Тканіна. Матэрыя» прадстаўлена больш як 25 работ творцы з Санкт-Пецярбурга. «Спалучаючы своеасаблівасць розных абрэзкаў, па-майстэрску працуючы з колерамі і кампазіцыяй, аўтар увасабляе ў тэкстылі мастацкія вобразы, якія адлюстроўваюць персанальнае светаўспрыманне. Акрамя колеру, тэкстуры і фактуры тканіны, мастак працуе з плаўленнем сінтэтычных матэрыялаў, вышыўкай, фарбаваннем і друкам на тканіне», — адзначаюць у галерэі. Выстаўка будзе доўжыцца да 24 красавіка.

На галоўнай сцэне Вялікага тэатра Беларусі 19 красавіка выступяць госці з Санкт-Пецярбурга — Міхаіл Векуа з Марыінскага і Алеся Пятрова з Міхайлаўскага тэатраў. Артысты выйдуць у партыях Германа і Графіні ў оперы Пятра Чайкоўскага «Пікавая дама», прытым для Алесі Пятровай гэта дэбют у беларускім Оперным тэатры. Як адзначылі ва ўстанове, галоўныя партыі вечарам 19 красавіка таксама выканаюць Марыя Галкіна (Ліза), Станіслаў Трыфанаў (Томскі), Аксана Волкава (Паліна), Дзіяна Трыфанава (Прылепа), Аляксандр Гелах (Чэкалінскі), Аляксандр Кеда (Сурын) і іншыя артысты. Дырыжор оперы «Пікавая дама» — Алег Лясун.

Сумесны выставачны праект Нацыянальнага цэнтра сучасных мастацтваў і *LIBRA* «Зачараванне Дэлакруа» прадставілі ў НЦСМ. Унікальная экспазіцыя ўпершыню ў Беларусі прадстаўляе маштабную рэтраспектыву работ найвялікшага французскага мастака XIX стагоддзя Эжэна Дэлакруа. Можна ўбачыць 100 літаграфій і гравюр, выкананых у Парыжы і Ляйпцыгу ў 1864, 1913 і 1928 гадах з замалёвак, эскізаў, малюнкаў і карцін самага плённага перыяду яго творчасці — з 1823 да 1857 года. «Мастак заўсёды надаваў вялікае значэнне працы над першапачатковымі эскізамі, у якіх павінны быць намечаны абрысы задуманага твора. Ён казаў: каб стварыць карціну, трэба валодаць мастацтвам бачыць у накідзе скончаны твор. Як даніна павагі такому падыходу Дэлакруа менавіта яго замалёўкі, эскізы, малюнкі і сталі лейтматывам усяго праекта "Зачараванне Дэлакруа"», — адзначылі арганізатары. Выстаўку можна ўбачыць да 29 мая.

Прэзентацыя выдання «Як мы любілі "Бітлз"» адбылася ў Санкт-Пецярбургу. Як патлумачыў ТАСС аўтар кнігі, пісьменнік і журналіст, лаўрэат прэміі імя Паўла Бажова Дзмітрый Карасюк, твор можна лічыць першым даследаваннем такой з'явы, як бітламанія ў СССР. Збор матэрыялу і напісанне кнігі занялі шэсць гадоў, за гэты час ён узяў каля 200 інтэрв'ю. «Слова "бітламанія", якое вынесена на вокладку кнігі, даволі ўмоўнае, — адзначае аўтар. — Я ўкладваў у яго не зусім тое значэнне, якое прынята на Захадзе. Там у 60-я гады гэта было фанатычнае, некалькі істэрычнае пакланенне сваім кумірам. У нас бітламанія — гэта хутчэй уплыў на музычнае, культурнае і нават грамадска-палітычнае жыццё вялізнай краіны». Па яго словах, кнігу прадставілі ў Пецярбургу, таму што гораду і яго жыхарам адведзена ў ёй асаблівае месца.

Кніга «Фёдар Шаляпін у Падмаскоўі» журналіста Мікалая Гарбунова выпушчана маскоўскім выдавецтвам «Крук», перадае «ІТАР-ТАСС». Яна прысвечана 150-годдзю з дня нараджэння рускага артыста, якое будзе адзначацца ў 2023 годзе. Мікалай Гарбуноў амаль 45 гадоў займаецца даследаваннем творчасці Фёдара Шаляпіна. Гэтым разам аўтар знаёміць чытачоў з тымі месцамі ў Падмаскоўі, дзе спявак адпачываў, выступаў у летніх тэатрах, сустракаўся з вядомымі пісьменнікамі, даваў канцэрты для рабочых, рыхтаваў ролі для оперных спектакляў. Кніга 10-я ў аўтарскай серыі. У першых дзевяці размова ідзе пра тое, як Шаляпін прадстаўляў рускую музыку, культуру, мастацтва за мяжой.

**Цікавінкі ад Яўгеніі ШЫЦЬКІ**

# Уладзімір ГАЎРЫЛОВІЧ:
# «Важна не стаяць на месцы!»

**Наколькі важна развіццё творчых кантактаў і ўзаемадзеянне ўсёй пісьменніцкай супольнасці, незалежна ад нацыянальнай прыналежнасці, каб роля сучаснай літаратуры ў выхаванні маладога пакалення не зніжалася? «ЛіМ» пацікавіўся пра гэта ў заслужанага дзеяча культуры, старшыні Гомельскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі, празаіка і публіцыста Уладзіміра Гаўрыловіча.**

**— Уладзімір Мікалаевіч, абласное аддзяленне СПБ актыўна развівае стасункі праз творчыя кантакты і нават праекты не толькі з пісьменнікамі, але і нацыянальнымі арганізацыямі іншых краін, у тым ліку Расіі. Невыпадкова на XXV з’ездзе Саюза пісьменнікаў адзначалася вялікая праца менавіта вашай суполкі ў гэтым і іншых кірунках. Раскажыце, калі ласка, як пачыналася супрацоўніцтва, як увогуле ўсталёўваліся творчыя кантакты?**



— У грамадскай справе — так было, ёсць і будзе! — усё залежыць ад неабыякавых людзей і ад іх жадання нешта змяніць да лепшага. Так, на пачатку станаўлення нашай абласной арганізацыі я пазнаёміўся з бранскім калегам выдатным рускім паэтам Уладзімірам Сарочкіным, які летась заўчасна пайшоў з жыцця. Мы пачалі ездзіць на літаратурныя мерапрыемствы ў Бранск, Трубчэўск, удзельнічаць у святах з нагоды юбілеяў класікаў рускай літаратуры. Назіралі, вучыліся, як усё робяць нашы бранскія сябры і калегі. Што падабалася — пераносілі на гомельскую зямлю. Дзякуючы ім і заснавалі свой фестываль «Славянскія літаратурныя дажынкі», дамовіліся друкаваць пісьменнікаў на старонках нашых альманахаў. А потым пайшлі сумесныя калектыўныя зборнікі, у якіх абавязкова змяшчаліся творы як прафесіяналаў, так і пачаткоўцаў з абедзвюх краін, пачаліся ўзаемныя пераклады, прэзентацыі, майстар-класы, якія больш вопытныя калегі рабілі для пачаткоўцаў-гамяльчан. Гэта збліжала. З бранцамі мы сталі не проста сябрамі — адной сям’ёй, жаданымі і блізкімі духам пабрацімамі. Прытым, заўважу, яны звычайна просяць, каб мы з імі больш гаварылі па-беларуску, ім падабаецца мілагучнасць нашай мовы, і такія стасункі дапамагаюць не толькі перакладаць, але і разумець душу беларусаў.

**— Дарэчы, праз стасункі з бранскімі калегамі і завязвалася сувязь з творцамі іншых рэгіёнаў Расіі і нават славянскіх краін?**

— Так. Хутка пайшлі з намі на кантакт пісьменнікі з Трубчэўска, Рыльска, Курчатава, Курска, а таксама з украінскіх гарадоў, якія мяжуюць з Гомельшчынай і Расіяй. Нават стварылі сумеснае літаратурнае аб’яднанне «Славянскія званы», якое пасля перарасло ў Міжнародны саюз пісьменнікаў і майстроў мастацтва, арганізавалі нямала творчых акцый і праектаў, у тым ліку выдалі калектыўныя зборнікі, асноўнай задачай якіх было выхаванне патрыятычнай моладзі нашых краін на прыкладзе герояў Вялікай Айчыннай вайны, праз творчае ўзаемадзеянне. Было шмат абменаў дэлегацыямі, творчых паездак гомельскага літаратурнага актыву ў Расію. І да нас ехалі з задавальненнем. Бо і мы не стаялі на месцы. Кожны фестываль, напрыклад, «Славянскія літдажынкі» — гэта новая форма творчага ўзаемадзеяння, узаемапранікнення і ўздзеяння на чытача, асабліва маладзёжную аўдыторыю. Але, яшчэ раз падкрэслю, усё трымалася на нашым жаданні супрацоўнічаць (бо сродкаў, па сутнасці, у нас на гэта няма ніякіх) ды на радасці сустрэч, разумення, што побач з табой неабыякавыя творцы. Хоць яны і знаходзіліся за тысячы кіламетраў ад Гомеля.

**— На з’ездзе вы адзначылі: вялікім дасягненнем літаратараў Беларусі і Расіі з’яўляецца беларуска-расійскі праект «Берагі дружбы»…**

— Гэта сапраўды так. Некалькі гадоў таму незнаёмы мне рускі чалавек пастукаўся вечарам у дзверы маёй гомельскай кватэры. Прадставіўся: паэт, нафтавік па прафесіі, Леанід Юр’евіч Север. Аказалася: некалі з бацькамі жыў у Гомелі, а пасля сям’я вярнулася ў родны Таганрог. Працаваў у Рэчыцы ў «Беларуснафце», пасля былі гады нафтапромыслаў у Сібіры, вяртанне да бацькоў. І заўсёды пісаў вершы. А Беларусь для Леаніда назаўжды засталася малой радзімай.

За кубкам чаю мы дамовіліся аб супрацоўніцтве з растоўскімі калегамі: аб першых перакладах спачатку твораў удзельнікаў аматарскіх літаб’яднанняў, а пасля і прафесіяналаў. Так і нарадзілася наша «дзіця» — вядомы сёння фестываль і праект «Берагі дружбы». Ім і дагэтуль апякуецца сын Беларусі і Расіі Леанід Север. Я шчыры яго памочнік, каардыную ўжо амаль дзесяць гадоў творчыя працэсы па Беларусі. Гэта глабальны праект, можна сказаць, унікальны. Прычым шпаркімі крокамі развіваецца, штогод прыцягваючы ўсё больш моладзі з пісьменнікаў-прафесіяналаў.

За гэтыя гады на радзіме Чэхава з нашым удзелам выдадзена звыш 70 зборнікаў перакладаў паэзіі, у тым ліку 10 на беларускай мове. Маладыя перакладаюць маладых, прафесіяналы — прафесіяналаў і дапамагаюць у гэтай рабоце маладым! Цуд! Няма падобнага ў СНД! Праект ужо некалькі разоў атрымліваў Грант Прэзідэнта Расіі. Завяршаецца ён звычайна трохдзённым фестывалем на беразе Азоўскага мора і яшчэ трохдзённымі заняткамі ва Усерасійскай школе перакладу, па выніках якіх нашы канкурсанты — беларусы і расіяне — атрымліваюць веды і нават пасведчанні перакладчыкаў са славянскіх моў. Праект пашырае свае межы, і ў гэтым годзе ў ім удзельнічае ўжо амаль 60 творцаў з усіх абласцей Беларусі. Тут трэба выказаць словы падзякі і старшыні СПР Мікалаю Іванову, які беражэ наша ўнікальнае беларуска-рускае дзіця ад усіх бед, а таксама Мікалаю Чаргінцу, Праўленню СПБ, Алесю Карлюкевічу, Алене Стэльмах, маім калегам Людміле Кебіч, Алесю Казеку і іншым аднадумцам, якія толькі падключыліся, за стварэнне належнай атмасферы, магчымасць рэалізоўваць задуманае.

**— Ведаю, што фестываль «Берагі дружбы» афіцыйна стаў партнёрам гомельскіх «Славянскіх літаратурных дажынак»?**

— Так. І з гэтага выраслі, дарэчы, іншыя праекты. Уявіце толькі: у цяперашні няпросты час удалося знайсці падтрымку і прысвоіць імёны народнага пісьменніка Беларусі Івана Мележа, а таксама нашага асветніка і паэта Кірылы Тураўскага бібліятэкам і дамам культуры на Растоўшчыне! Тут мы, гамяльчане, шмат працавалі і разам з дырэкцыяй фестывалю «Берагі дружбы», з Няклінскай раённай (узначальвае абедзве структуры Леанід Север) і рэгіянальнай арганізацыяй «Саюз беларусаў Дона» (узначальвае мастак і паэт, грамадскі дзеяч, паляшук з Пінска Уладзімір Банцэвіч). Гэта больш чым праекты! А ў 2021-м ажыццявілі яшчэ адзін гуманітарна-асветніцкі праект: у дзень 100-годдзя Івана Мележа, які некалі ваяваў і быў паранены на Растоўскай зямлі, разам адкрылі ў Расіі музейны пакой беларускага класіка і нашага земляка.

**— А якія праекты ажыццёўлены нанова?**

— Па-першае, гэта выпуск міжнароднага альманаха «Літара. Литера. Ліцера». За два апошнія гады выйшла 6 тэматычных нумароў, толькі ў апошнім змешчаны творы 100 паэтаў і празаікаў Беларусі, Расіі і Украіны на іх родных мовах. Альманах збліжае, аб’ядноўвае славянскіх пісьменнікаў. У верасні мінулага года, нягледзячы на пандэмію, мы ажыццявілі дастаткова няпросты праект: упершыню падрыхтавалі і правялі ў Гомелі міжнародную канферэнцыю славянскіх літаратараў «Захаванне гістарычнай памяці сродкамі літаратуры і мастацтва — наш абавязак перад загінулымі, перад гісторыяй і наш абавязак перад сённяшнім і будучымі пакаленнямі». Прычым у працэсе ажыццяўлення да нас далучылася шмат новых творцаў з розных куткоў Расіі. Зараз яшчэ падводзім вынікі канферэнцыі, прысвечанай 80-годдзю пачатку Вялікай Айчыннай вайны: фарміруем зборнік дакладаў і паведамленняў… Да гэтага быў арганізаваны на беразе ракі Сож Першы злёт аматарскіх аб’яднанняў СНД: і выступленні, і вучоба пачаткоўцаў з 12 літаб’яднанняў; дзве каманды былі з Бранскай і Растоўскай абласцей Расіі, адна — з Украіны.

**— Ці чакаць сёлета новых ініцыятыў?**

— Вядома. Нароўні з існуючымі праектамі, у якіх задзейнічана шмат творчай моладзі і маіх калег-пісьменнікаў, мы вядзём падрыхтоўку да правядзення ў Гомелі на пачатку восені адразу чатырох літаратурна-музычных вечароў вядомых пісьменнікаў Расіі і Беларусі, а таксама сумесны вечар «Калейдаскоп славянскага гумару». Акрамя гэтага, да Дня беларускага пісьменства арганізавалі міжнародную акцыю па зборы новых кніг з цікавымі аўтографамі «Добрая кніга — ад шчырага сэрца» для Добрушскай і Жыткавіцкай бібліятэк, у якой прымаюць удзел і нашы партнёры, сябры з 10 пісьменніцкіх арганізацый Саюза пісьменнікаў Расіі. У стадыі прапрацоўкі — праекты з пісьменнікамі Расіі і Балгарыі.

**Гутарыла Аліса БРАТКА**

## Прэзідыум Саюза пісьменнікаў Беларусі (новы склад):

1. Андрыевіч Уладзімір Уладзіміравіч
2. Аўруцін Анатоль Юр’евіч
3. Аўсеп’ян Ірына Васільеўна
4. Бадак Аляксандр Мікалаевіч
5. Башлакоў Міхаіл Захаравіч
6. Гальпяровіч Навум Якаўлевіч
7. Гаўрыловіч Уладзімір Мікалаевіч
8. Голубева Наталля Аляксандраўна
9. Гусачэнка Тамара Іванаўна
10. Дарашэвіч Уладзімір Мікалаевіч
11. Дземідовіч Таццяна Анатольеўна
12. Казека Аляксандр Мікалаевіч
13. Карлюкевіч Аляксандр Мікалаевіч
14. Кебіч Людміла Антонаўна
15. Мазго Уладзімір Мінавіч
16. Марціновіч Аляксандр Андрэевіч
17. Марчук Георгій Васільевіч
18. Матвіенка Анатоль Яўгенавіч
19. Мукавозчык Андрэй Мікалаевіч
20. Мусіенка Сяргей Рыгоравіч
21. Пазнякоў Міхаіл Паўлавіч
22. Праўдзін Віктар Аляксандравіч
23. Прыгодзіч Зіновій Кірылавіч
24. Радзівончык Дзмітрый Мікалаевіч
25. Саверчанка Іван Васільевіч
26. Саламаха Уладзімір Пятровіч
27. Саланец Рыгор Васільевіч
28. Семяняка Валянцін Міхайлавіч
29. Стэльмах Алена Анатольеўна
30. Трахімёнак Сяргей Аляксандравіч
31. Ханок Эдуард Сямёнавіч
32. Чайка Ніна Цімафееўна
33. Чаргінец Мікалай Іванавіч
34. Чарота Аляксей Іванавіч
35. Чыж-Літаш Ганна Пятроўна
36. Шырко Васіль Аляксандравіч
37. Юркін Іван Захаравіч

## Праўленне Саюза пісьменнікаў Беларусі (удакладнены склад):

1. Андрыевіч Уладзімір Уладзіміравіч
2. Аўруцін Анатоль Юр’евіч
3. Аўсеп’ян Ірына Васільеўна
4. Бадак Аляксандр Мікалаевіч
5. Башлакоў Міхаіл Захаравіч
6. Гальпяровіч Навум Якаўлевіч
7. Гаўрыловіч Уладзімір Мікалаевіч
8. Гігін Вадзім Францавіч
9. Голубева Наталля Аляксандраўна
10. Гусачэнка Тамара Іванаўна
11. Дарашэвіч Уладзімір Мікалаевіч
12. Дземідовіч Таццяна Анатольеўна
13. Казека Аляксандр Мікалаевіч
14. Карлюкевіч Аляксандр Мікалаевіч
15. Карызна Уладзімір Іванавіч
16. Касцючэнка Наталля Мікалаеўна
17. Кебіч Людміла Антонаўна
18. Мазго Уладзімір Мінавіч
19. Марціновіч Аляксандр Андрэевіч
20. Марчук Георгій Васільевіч
21. Матвіенка Анатоль Яўгенавіч
22. Мукавозчык Андрэй Мікалаевіч
23. Мусіенка Сяргей Рыгоравіч
24. Пазнякоў Міхаіл Паўлавіч
25. Праўдзін Віктар Аляксандравіч
26. Прыгодзіч Зіновій Кірылавіч
27. Радзівончык Дзмітрый Мікалаевіч
28. Саверчанка Іван Васільевіч
29. Саламаха Уладзімір Пятровіч
30. Саланец Рыгор Васільевіч
31. Семяняка Валянцін Міхайлавіч
32. Стэльмах Алена Анатольеўна
33. Трафімаў Сяргей Анатольевіч
34. Трахімёнак Сяргей Аляксандравіч
35. Ханок Эдуард Сямёнавіч
36. Хвалей Яўген Іванавіч
37. Чайка Ніна Цімафееўна
38. Чаргінец Мікалай Іванавіч
39. Чарота Аляксей Іванавіч
40. Чыж-Літаш Ганна Пятроўна
41. Шырко Васіль Аляксандравіч
42. Юркін Іван Захаравіч
43. Ясеў Уладзімір Віктаравіч

# Абярэг ад манкурцтва

**Значэнне слова «першы» тлумачыць наўрад ці трэба. Адпаведнае і стаўленне да таго, хто дасягнуў гэтага. Калі ж двойчы, то яшчэ больш паважнае. Але ёсць і тыя, хто на гэтым не спыняецца. Яскравы прыклад— Іван Саверчанка. Адзін з самых аўтарытэтных сучасных гісторыкаў літаратуры, літаратуразнаўца і крытык. Заявіў пра сябе і як празаік. Аднак першапраходства ў асноўным звязана з яго галоўнай сферай дзейнасці.**

У манаграфіі «Старажытная паэзія Беларусі (XVI — першая палова XVII стст.)» ён яшчэ ў 1992 годзе ўпершыню ў філалагічнай навуцы прааналізаваў найважнейшыя набыткі нацыянальнай паэтычнай культуры. Засведчыў, што беларускае прыгожае пісьменства ўжо ў даўнія часы мела высокі ўзровень мастацка-эстэтычнага развіцця. Адметнасць гэтага даследавання і ў тым, што ў дадатку да яго можна пазнаёміцца з рарытэтнымі паэтычнымі помнікамі, геральдычнымі і эмблематычнымі вершамі, якія Іван Васільевіч асабіста адшукаў у архівах і кнігасховішчах.

Першапраходцам стаў і бліжэй да нашых дзён, аб чым засведчыла манаграфія «Паэтыка і семіётыка публіцыстычнай літаратуры Беларусі XVI — XVII стст.» (2012). Абсягі даследавання звязаны з ацэнкай інтэлектуальнай культуры нашага народа эпохі Рэнесансу і Барока. Першаступенная ўвага звернута на галоўныя дасягненні тагачаснай філалагічнай і грамадскай думкі. Упершыню раскрыта жанравая шматстайнасць публіцыстыкі тых часоў, адзначана літаратурная і мастацка-эстэтычная каштоўнасць спадчыны выбітных пісьменнікаў.

Ганарыцца сваім, далучаць суайчыннікаў да таго, што шмат у чым пакрылася пылам часу, безумоўна, вельмі важна. А таксама каб гэтыя набыткі сталі вядомымі і прадстаўнікам іншых народаў. Дбаючы пра гэта, Іван Саверчанка падрыхтаваў кнігу «Памятники литературы Беларуси X—XVIII веков», у якую ў яго перакладзе на рускую мову ўвайшлі найбольш значныя творы такіх выдатных майстроў мастацкага слова, філасофскай думкі, як Кірыла Тураўскі, Францыск Скарына, Сымон Будны, Васіль Цяпінскі і іншыя.

Напісаў і фундаментальную манаграфію «Сымон Будны — гуманіст і рэфарматар» (1993). Па сваёй першапраходнай значнасці да яе прымыкае яшчэ адна — «Aurea mediocritas. Кніжна-пісьмовая культура Беларусі: Адраджэнне і ранняе барока» (1998).

Рыхтаваў і факсімільнае ўзнаўленне «Апостала» Францыска Скарыны, выдадзенае Бонскім універсітэтам. Спецыяльна напісаў для яго асобны раздзел, каб нямецкі чытач ва ўсёй паўнаце спасціг галоўныя гуманістычныя ідэі нашага знакамітага асветніка. А вось брашура па сацыяльнай філасофіі «Чалавечае вымярэнне: інтэлектуальная і духоўная сферы» (2004), хоць і выйшла ў Мінску, мае паралельны тэкст і па-нямецку. Гэтая праца на дзіва актуальная сваёй праблематыкай. Найперш тым, што ў ёй дакладна сфармулявана сучасная нацыянальная ідэя і формы яе ўвасаблення. Істотна і тое, што ўсебакова абгрунтавана, наколькі сёння запатрабавана развіццё навукі і адукацыі, гуманітарных ведаў і мастацтваў. Як і нацыянальнай культуры і медыя, без чаго таксама немагчыма ўзбагачэнне інтэлектуальнага патэнцыялу краіны, яе сацыяльна-эканамічнага прагрэсу. У цэлым жа гэта толькі на карысць пабудовы дэмакратычнага і прававога грамадства.

Калі ж мець на ўвазе выдатныя гістарычныя постаці, то ў адных выпадках Іван Васільевіч паглыблена пранікае ў свет жыцця і творчасці тых, чые імёны на слыху: Сымон Будны, Францыск Скарына, а таксама, напрыклад, Леў Сапега, а ў іншых ступае па цаліку. Яскравы прыклад — кніга «Астафей Валовіч» (1992), у якой упершыню раскрыта вялікая роля ў нацыянальнай гісторыі найвыдатнейшага палітыка-рэфарматара сярэдзіны XVI стагоддзя.

Прыхільна чытачамі і крытыкай была сустрэта кніга «Блеск короны». Калі манаграфіі, як гэта відаць з іх назваў, прысвечаны пэўным перыядам развіцця беларускай літаратуры, дык гэта аповед аб выдатных асобах. Жывучы ў розныя эпохі, сваімі добрымі справамі яны назаўсёды прапісаліся ў нашай нацыянальнай гісторыі. А яшчэ, хай гэта не падасца дзіўным, як бы з'яўляюцца і нашымі сучаснікамі, бо тое, што рабілі на карысць Радзімы, спрацоўвала і на будучыню.

Назву кнізе дала аднайменная аповесць-нарацыя. Нарацыя — гэта аповед аб гістарычных асобах з выкарыстаннем элементаў мастацкага домыслу. Пра «Блеск короны» можна гаварыць як пра пачатак у сучаснай беларускай літаратуры гатычнага рэалізму. У гэтым творы разглядаецца той перыяд з жыцця Полацкага княства, калі ў ім гаспадарыў Усяслаў Брачыславіч, якога празвалі Чарадзеем.

Падыход, які Іван Саверчанка ўзяў для спасціжэння вобраза таго, хто ў пантэоне славутых сыноў Бацькаўшчыны стаіць на адным з першых месцаў, апраўданы. Хоць пра яго і напісана шмат, нельга сцвярджаць, што жыццё і дзейнасць Усяслава Чарадзея разгледжаны ўсебакова. Гісторыкі, пісьменнікі выкарыстоўваюць адны і тыя ж факты, а іх не так і шмат. Таму, каб лепш і глыбей пранікнуць у сутнасць феномена, якім з'яўляецца ён, не абысціся і без пэўнага дадумвання таго, што магло быць, але не мае дакументальнага пацвярджэння. Багатая навуковая і мастацкая інтуіцыя даследчыка дазваляе яму ўсё падаць настолькі праўдападобна, што ніколькі не сумняваешся ў рэальнасці гэтага.

Расказваючы пра Усяслава Брачыславіча, Іван Саверчанка, безумоўна, паказвае і людзей з яго найбліжэйшага атачэння, пры гэтым называючы іх імёны. Праўда, у асноўным гэта персанажы, народжаныя аўтарскай фантазіяй. Аднак у дадзеным выпадку неістотна, як звалі таго ці іншага чалавека. Як і тое, ці існаваў ён у сапраўднасці. Канешне ж, былі людзі, якія сустракаліся з полацкім князем. Ён абмяркоўваў з імі надзённыя пытанні, раіўся, калі ў нечым сумняваўся, а асобных браў у саюзнікі пры вырашэнні важных задач. Увядзенне ў сюжэтную канву аповесці выдуманых персанажаў добра спрацоўвае на вырашэнне асноўнай аўтарскай задумы — падаць Усяслава Чарадзея сынам свайго часу, але адначасова паказаць, як ён у сваіх справах, памкненнях і абганяў яго. І не адзін быў. Поруч — надзейныя людзі, без якіх як без рук.

«Золотой амулет» — традыцыйнае жыццеапісанне галоўнага героя ад яго нараджэння да адыходу ў вечнасць. Гэта не проста біяграфія, а біяграфія мастацкая. Іван Саверчанка, добра ведаючы асаблівасці жанру, будуе твор так, каб гэта быў не проста аповед аб тым, што вядома аб жыцці Усяслава Чарадзея. У неабходных месцах і не абмяжоўваецца мастацкім домыслам. У творы знайшлося месца і пейзажным замалёўкам, лірычным адступленням. Усё для таго, каб лепш паказаць не толькі час, у якім жыў гэты полацкі князь, але і дух, калі містычнае, а ў сённяшнім разуменні ўжо легендарнае, суседнічала з рэальным.

Найбольш упэўнена Іван Васільевіч адчувае сябе ў самым пачатку твора.



*Фота Кастуся Дробава.*

*Іван Саверчанка.*

Праўдзіва, пераканаўча пададзена атмасфера тагачаснага Полацка. Нібыта сам прысутнічаеш у даўнім горадзе, які сцішыўся ў прадчуванні нараджэння цуду, а што ён адбудзецца, — ніякага сумнення. Вешчуны неаднойчы аб гэтым нагадвалі. Таму, калі наступіў час здзяйснення прадказання, усіх напоўніла і трывога, і радасць, да якіх дадаліся і дагэтуль невядомыя пачуцці, бо нічога падобнага раней не назіралася:

«Полоцкий детинец молчал. Город тревожно ждал рождения княжича-наследника. На севере в небесах горел-бушевал страшный огненный Змей. Он полыхал жаром, окрашивая все небо в багряный цвет. Окрестность сплошь сияла, дрожала от испуга и ужаса.

Близилась полночь. Глаза семи ведьмаков-волхвов, прибывших в детинец, светились: их вековая надежда вскоре должна была осуществиться. "У небесного Змея родится человек-богатырь. Душа его будет связана с живым и мёртвым миром. И он сможет слышать голоса земли и воды, господствовать над людьми и хищными зверями", — уверенно шептались колдуны».

Прырода таксама неабыякавая да таго, што адбываецца: «Двина величественно вздыхала, изредка выворачивала внутренности, выявляя сдерживаемую мощь. Стремительная Полота врезалась в могучее тело Двины, мгновенно поглощалась ею и исчезала в чреве реки».

Патрымаўшы чытача ў напружанні, аўтар паведамляе аб тым, чаго ўсе з такім нецярпеннем чакалі: «Ведьмаки не ошиблись. Как они и ожидали, на землю пришел князь-богатырь. Мальчик появился на свет с родимой отметиной на голове — знаком могучего рыцаря. Колдуны посоветовали матери навязать на сметку младенца воинскую повязку: "Пусть княжич никогда её не снимает. Она позволит быть ему сдержанным и миролюбивым"».

Назва аповесці ўспрымаецца сімвалічна. Дасягнуўшы сталасці, Усяслаў Чарадзей быў урачыста пасвечаны ў рыцары. Вядзьмак Амелія надзеў яму на шыю ланцужок з залатым амулетам, «на подвеске чётко просматривалось изображение Перуна — могучего бога грома и молнии, который сидел на коне, вооружённый тяжёлым молотом, луками и стрелами». Сказаў тады вядзьмак: «Этот древний амулет имеет невероятную силу. Он даст тебе, княжич, власть над людьми, всегда будет надежно защищать от вражеской стрелы и меча, отведет беду и болезни».

Амулет, якім уганаравалі Усяслава Брачыславіча, калі глядзець шырэй, — своеасаблівы абярэг для ўсёй Беларусі. Ён абараняў не толькі яго самога ад многіх бед. Пачынаючы ад Усяслава Чарадзея, гэтага знакамітага полацкага князя-дзяржаўніка, ён, па сутнасці, абараняў і народ беларускі на шматвяковым шляху яго развіцця, спрыяў станаўленню.

Сімвалічная назва і яшчэ адной кнігі Івана Саверчанкі — «Ладья сокровищ», у якой прадстаўлены творы беларускіх пісьменнікаў XIX — пачатку XX стагоддзя. Ладдзёй усходнія славяне называлі свае судны, на якіх ужо ў VII стагоддзі паспяхова плавалі з «варагаў у грэкі». А літаратура, мастацтва, культура ў цэлым, з'яўляючыся духоўным скарбам, таксама здатны пераадольваць вялікі шлях. І ў часе, і ў адлегласці.

Іван Васільевіч паспяхова абжывае і жанр гісторыка-дакументальных хронік: «Рыцар», «Рой», «Нашэсце», «Трыумф». Кожная з іх адметная не толькі жанравым вызначэннем. Відавочна, як у яго творчасці ўзмацняюцца празаічныя элементы, а тое, што было ў сапраўднасці, падмацоўваецца ўдалай рэканструкцыяй як абставін, калі адбывалася пэўнае дзеянне, так і асобных момантаў з жыцця тых, пра каго расказваецца. Дасягнуць гэтагага Саверчанку-празаіку дапамагае Саверчанка-гісторык літаратуры, які, надаючы вялікае значэнне творчай фантазіі, прытрымліваецца і звестак, што захаваліся ў пісьмовых крыніцах. Тым самым гістарычная рэканструкцыя мацуецца на празорлівай інтуіцыі.

Хтосьці з выдатных дзеячаў сказаў: «Калі чалавек з мінулым на "Вы", то са сваёй свядомасцю ён заўсёды на "ты"». У тым сэнсе, што паважныя адносіны да падзей даўніх, людзей слаўных сведчаць, наколькі той, хто прытрымліваецца гэтага прынцыпу, і сам адбыўся як асоба. Як гэта праўдзіва, і пацвярджае жыццё і творчасць доктара філалагічных навук прафесара Івана Саверчанкі.

**Ганарыцца сваім, далучаць суайчыннікаў да таго, што шмат у чым пакрылася пылам часу, безумоўна, вельмі важна. А таксама каб гэтыя набыткі сталі вядомымі і прадстаўнікам іншых народаў. Дбаючы пра гэта, Іван Саверчанка падрыхтаваў кнігу «Памятники литературы Беларуси X—XVIII веков», у якую ў яго перакладзе на рускую мову ўвайшлі найбольш значныя творы такіх выдатных майстроў мастацкага слова, філасофскай думкі, як Кірыла Тураўскі, Францыск Скарына, Сымон Будны, Васіль Цяпінскі і іншыя.**

Усяго на даследчыцкім і пісьменніцкім рахунку Івана Васільевіча 12 фундаментальных манаграфій і звыш 300 артыкулаў і раздзелаў. Ён напісаў 3 літаратурна-мастацкія кнігі, а таксама падрыхтаваў 6 выданняў помнікаў беларускага пісьменства і шэдэўраў нацыянальнай літаратуры X — пачатку XX стст. Лаўрэат Міждзяржаўнай прэміі СНД «Зоркі Садружнасці» і Нацыянальнай літаратурнай прэміі. Шмат робіць Іван Саверчанка і як дырэктар Інстытута літаратуразнаўства імя Янкі Купалы Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Непасрэдна пад яго кіраўніцтвам падрыхтаваны адзін доктар і тры кандыдаты навук.

Усё, што зроблена і робіцца ім, — не толькі важкі ўклад у развіццё нацыянальнай акадэмічнай навукі. Гэта і своеасаблівы абярэг ад манкурцтва, беспамяцтва для кожнага, хто далучыцца да яго творчасці. Сустрэўшы сваё 60-годдзе, несумненна, і далей будзе працаваць гэтаксама плённа, мэтанакіравана вяртаючы гістарычную памяць, а іншым паказваючы ў гэтым прыклад.

**Алесь МАРЦІНОВІЧ**

# Слухаючы народ

**Сярод выданняў, падрыхтаваных да 100-годдзя беларускай акадэмічнай навукі (яны, як і трэба было чакаць, з'явіліся ў выдавецтве «Беларуская навука»), — і калектыўнае даследаванне (укладанне і агульная рэдакцыя І. Дубянецкай і С. Санько) «Трошкі бліжэй да Сонца, трошкі далей ад Месяца. Беларуская народная філасофія». Такую нечаканую і арыгінальную назву падказаў не хто-небудзь, а сам Уладзімір Караткевіч.**

Безумоўна, Уладзімір Сямёнавіч і не здагадваўся, што прыйдзе час з'яўлення такой кнігі, ды яшчэ без яго ўдзелу. Але што не быў абыякавым да ўсяго таго, пра што ў ёй гаворыцца, сумнявацца не даводзіцца. Інакш бы і не з'явілася яго гістарычная проза. Толькі не ў традыцыйным яе разуменні. Кажучы словамі аднаго з найбольш вядомых даследчыкаў яго творчасці Анатоля Вераб'я, гісторыя цікавіла Уладзіміра Караткевіча «пераважна як прытча, легенда і ў тым плане, які ўплыў зрабіла яна на духоўнае жыццё народа, на яго грамадскую свядомасць. Пісьменніку характэрна рамантычнае, фальклорна-легендарнае асэнсаванне мінуўшчыны».




Уважлівае знаёмства з яго творамі і падказала даследчыкам і складальнікам кнігі, як лепш назваць яе. Ёсць жа ва Уладзіміра Сямёнавіча казка «Чортаў скарб», у якой апавядаецца пра тое, што даўным-даўно адбывалася» «ў нейкім прыгожым краі, трошкі бліжэй да Сонца і трошкі далей ад Месяца, у краі, багатым залатымі нівамі, празрыстымі рэкамі, сінімі азёрамі ды цёмнымі пушчамі... Словам, у тым краі, дзе мы з табою жывём, стаяла, а можа, і цяпер стаіць, адна хата». Ды і адна з п'ес Уладзіміра Караткевіча называецца «Трошкі далей ад Месяца…».

Для назвы раздзелаў і падраздзелаў кнігі таксама ўзяты цытаты з твораў, выказванняў пісьменнікаў. Да ўсяго кожны падраздзел пачынаецца эпіграфам. Прыцягненне аўтараў шырокае. Суседнічаюць сучасныя літаратары і мысляры. Яны на роўных адчуваюць сябе з тымі, хто жыў у эпоху Сярэднявечча, Рэнесансу, Рэфармацыі, Асветніцтва. Падобны прыём выкарыстаны для таго, каб чытач атрымаў як мага больш поўнае ўяўленне і аб тым, як народнае светабачанне пэўнай з'явы ўспрымалася тымі, хто меў да яе прафесійнае дачыненне. Пры гэтым маючы да ўсяго рознае ўспрыманне. З чымсьці пагаджаючыся, надаваў яму новае гучанне. Маючы сваё разуменне прадмета гаворкі, нешта ўдакладняў, асэнсоўваў глыбей, а то і аспрэчваў, выказваючы рэзка супрацьлеглую думку.

Тым самым часы і адлегласці збліжаюцца, мінулае ўрываецца ў дзень сённяшні. Такое адчуванне, што з гістарычнага напластавання чуваць голас нашых далёкіх продкаў. Мы не ведаем іх імёнаў і ніколі не даведаемся. Адно сумнення не выклікае: гэта гаворыць беларускі народ. Не важна, кім тады былі тыя, хто па-свойму ўяўляў свет і Сусвет. Не так і істотна, каму пакланяліся яны, каго і што адпрэчвалі. У што верылі, а чаму душа іх працівілася. З крывічоў, дрыгавічоў, радзімічаў, палян, а пазней ліцвінаў пачыналіся мы, беларусы. Лепш ведаць іх — значыць, і саміх сябе.

Гэтаму пазнанню і дапамагае кніга «Трошкі бліжэй да Сонца, трошкі далей ад Месяца». Не толькі ўдала падабраным, скампанаваным, асэнсаваным і пададзеным матэрыялам, але і стварэннем належнага візуальнага раду. Выявы з ілюстраваных манускрыптаў, а таксама друкаваных выданняў XV — XVII стагоддзяў яшчэ больш набліжаюць нас да тых даўніх, дазваляюць кожнаму, хто знаёміцца з гэтым даследаваннем, даведацца, як дапытлівыя нашы продкі, самі таго не разумеючы, пачыналі ўсведамляць сябе народам. Пакрысе выкрышталізоўвалася тое, што Янка Купала афарыстычна акрэсліў жаданне «людзьмі звацца». А вокладка даследавання — нібы ўваходныя дзверы ў храм народнага Адраджэння. На першай старонцы яе — гравюра «Сонца маладзіковае і сілы нябесныя» з Бібліі Францыска Скарыны, на чацвёртай — аркуш 16 «Каін і Авель» з Бібліі Васіля Кораня.

Нічога падобнага на гэтае даследаванне ў Беларусі не было, што само па сабе, безумоўна, важна. Істотна і тое, што кніга, у аснову якой пакладзена нямала спецыфічнага матэрыялу (таму не абышлося без навуковых тэрмінаў) не толькі не адштурхоўвае ад сябе шараговага чытача, але і выклікае вялікую цікаўнасць. Пацвярджэнне таму — за кароткі час яна вытрымала два выданні.

Не менш важна і іншае, а калі добра разабрацца, то яшчэ і ў большай ступені істотнае. На гэтым засяроджана ўвага і ў «Заключэнні»: «Выкананае даследаванне — першая не толькі ў Беларусі, але і ва ўсёй еўрапейскай (і шырэй — заходняй) навуцы спроба даследавання этнафіласофіі народа, прыналежнага да еўрапейскай культуры. Гэта першы плён прачытання беларускай народнай традыцыі светамыслення як інтэлектуальнай перадгісторыі Беларусі і беларускага народа на аснове цэласнай рэканструкцыі яго аўтэнтычнага светабачання, кагнітыўных асноў, сацыяльных мадальнасцей і аксіялагічных канцэптаў».

**Для назвы раздзелаў і падраздзелаў кнігі таксама ўзяты цытаты з твораў, выказванняў пісьменнікаў. Да ўсяго кожны падраздзел пачынаецца эпіграфам. Прыцягненне аўтараў шырокае. Суседнічаюць сучасныя літаратары і мысляры. Яны на роўных адчуваюць сябе з тымі, хто жыў у эпоху Сярэднявечча, Рэнесансу, Рэфармацыі, Асветніцтва. Падобны прыём выкарыстаны для таго, каб чытач атрымаў як мага больш поўнае ўяўленне і аб тым, як народнае светабачанне пэўнай з'явы ўспрымалася тымі, хто меў да яе прафесійнае дачыненне.**

Сам сябе не пахваліш? А калі ёсць за што?! Ды яшчэ і падказка іншым даследчыкам. Не спыняцца ў гэтым кірунку, глыбей пранікаць у нацыянальную этнафіласофію. Вобразна кажучы, слухаць народ. Беларускі народ! Яго не трэба вучыць, як жыць. У яго неабходна вучыцца. Прытым сягаючы і ў мінулае, у якім так шмат таго, што патрэбна і сёння. Іншым народам таксама.

**Еўдакім ДРОМІН**

# Выпрабаванне магіяй

**Летась у прыватным выдавецтве Віктара Хурсіка свет пабачыла новая кніга Таццяны Сівец, вядомай журналісткі, паэтэсы, лаўрэаткі многіх літаратурных прэмій. Зборнік пад рамантычнай назвай «Заўтра будзе сонца!» змяшчае ў сабе п'есы, напісаныя аўтаркай «цягам апошніх пятнаццаці гадоў». Выданне склалі пераважна дзіцячыя творы, але маюцца ў ім і тэксты для больш дарослай аўдыторыі. Некаторыя ўжо паспелі атрымаць сцэнічныя ўвасабленні, іншыя толькі чакаюць свайго часу.**

Амаль усе п'есы ў новым зборніку Таццяны Сівец (за выключэннем хіба што адной — «Куды прапала малпа Маня?») не маюць жанравага вызначэння. Складана сказаць, аўтарка наўмысна рассоўвае такім чынам праслаўтыя рамкі альбо гэта абумоўлена нейкімі іншымі прычынамі. А ўсё ж зразумець, які канкрэтна ў дадзеную хвіліну перад табою твор: просценькая павучальная казка для дзяцей малодшага ўзросту ці замаскіраваная пад такую казку пранізлівая трагедыя аб Вялікім тэроры — атрымліваецца не адразу.

Зрэшты, абраны падыход спрыяе больш глыбокаму чытанню, прымушае рэцыпіента ні на секунду не паслабляць увагу. Паказальнай у гэтых адносінах з'яўляецца п'еса «Амазонкі», якой выпала адкрываць кнігу. У цэнтры гісторыі — эпізод з жыцця паспяховай тэлевядучай Карыны Васілеўны. За сваю папулярнасць гераіня плаціць дорага — уласнай рэпутацыяй: людзі яе недалюбліваюць, і зусім не беспадстаўна. Аднак нечакана (як тое заўсёды і бывае) у жыццё грубай і вечна азлобленай Карыны ўмешваецца хвароба — рак грудзей.




Учора яна смяялася з мамолага, якога запрасілі госцем на шоу, а сёння звяртаецца да яго па дапамогу. У экстрэмальнай сітуацыі Таццяна Сівец заканамерна прымае бок гераіні, суперажывае яе трагедыі, але забывае прытым далучыць да таго і чытачоў. Эпізод назад Карына зняважліва раскідвае па студыі старонкі неўпадабанага ёю сцэнарыя, а цяпер, калі ад яе ўсе адварочваюцца, гэткі калектыўны байкот чамусьці выстаўляецца як здрадніцтва. Такі перакос не дазваляе з поўнай упэўненасцю гаварыць аб закладзенай аўтаркай ідэі.

Кампанію «Амазонкам» на старонках кнігі склалі шматлікія дзіцячыя п'есы. Дзве з іх — «Брык і Шуся шукаюць лета» і «Не расказвай мне казкі» — ужо пастаўлены ў Тэатры юнага гледача — у 2010 і 2018 гадах адпаведна. Яшчэ некаторыя могуць быць знаёмы чытачам па кніжках прозы, а вось астатнія сюжэты ўбачылі свет упершыню. У творах «КМЧ: курсы маладых чараўнікоў» і «Шафа» аўтарка, наследуючы «Сіняй птушцы» Метэрлінка (зрэшты, яе ўплыву не пазбегла ніводная п'еса для дзяцей), выпрабоўвае сваіх герояў магіяй.

Толькі калі ў бельгійца дзеці пускаліся ва ўяўную вандроўку па тым свеце, то ў беларускай пісьменніцы — па народных паданнях і міфах. Так, у «КМЧ» галоўная гераіня, дзяўчынка трынаццаці гадоў, волею аўтаркі трапляе ў чароўны лес, населены дзівоснымі істотамі: ад Ката Варгіна, караля кашэчага царства, і Жалгіуна-Каралюса, караля царства вужовага, да старога Варлівокі і вечна маладога Кляскуна. За аснову ўзяты не заезджаны матэрыял, да таго ж драматург вельмі па-майстэрску перастаўляе акцэнты ў вядомых усім гісторыях.

Бадай, найбольш цікавай п'есай у зборніку стала перадапошняя — «Шафа». Калі ў іншых тэкстах праступаюць сляды метэрлінкаўскага сімвалізму, то ў «Шафе» можна пачуць (прабачце за каламбур) і водгаласы творчасці Купалы, а канкрэтна — «Тутэйшых» (розніца паміж персанажамі ўзмацняецца моўным канфліктам). Акрамя таго, твор вылучае смелая тэма — жахлівыя падзеі 30-х гадоў вачыма нявінных дзяцей. Аўтарка не баіцца пакідаць намёкі на педафілію, гвалт, не баіцца пазбавіць дарослую аўдыторыю хэпі-энду. Фармальна ён тут захаваны, але, чытаючы паміж радкоў, разумееш, што далёка не ўсё так адназначна.

**Мікіта ШЧАРБАКОЎ**

# Знакі прыналежнасці і абароны

**Адной з прыкметных навінак кніжнага рынку апошніх месяцаў, тэматычна блізкіх нашай газеце, стала рускамоўнае навукова-папулярнае выданне «Гісторыя беларускіх кніжных знакаў XVI—XX стст.», якое нядаўна пабачыла свет у Выдавецкім доме «Звязда». Падрабязнае гістарычнае даследаванне, здзейсненае вядомым бібліяфілам, калекцыянерам гравюр і экслібрысаў Алегам Судлянковым, азнаменавала сабой заснаванне новай серыі — «История книги. Гісторыя кнігі».**




Міжнародны рэдакцыйны савет новаўтворанай серыі склалі масцітыя даследчыкі, мастакі, філолагі, збіральнікі рэдкіх выданняў, кніга- і мастацтвазнаўцы. Пачэснае месца сярод іх займае Міхаіл Баразна, прафесар, рэктар Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў, які выступіў рэцэнзентам першай кнігі. У савет таксама ўвайшлі Ганна Ціханава-Йарданова (Балгарыя), Святлана Ананьева (Казахстан), Алег Ласунскі (Расія), Алесь Суша, Алег Судлянкоў, Наталля Шаранговіч, Ганна Запартыка і Алесь Карлюкевіч.

Тэма экслібрысаў — сведчанняў прыналежнасці фаліянта таму ці іншаму ўладальніку — у якасці заявачнай абрана зусім не выпадкова. У рэшце рэшт, знаёмства з кніжным знакам апярэджвае ўласна працэс чытання, а самі экслібрысы, як даводзіць Алег Судлянкоў, — з'ява, не нашмат маладзейшая за кнігу. Адны з першых падобных знакаў былі знойдзены ажно на гліняных дошчачках у бібліятэцы асірыйскага цара Ашурбаніпала, што месцілася ў яго палацы ў горадзе Ніневії. Знаходкі адносяцца да VII ст. да нашай эры.

Навукова-папулярнае выданне «Гісторыя беларускіх кніжных знакаў XVI—XX стст.» адрасавана шырокаму колу чытачоў. Яно спадабаецца ўсім, хто цікавіцца гісторыяй беларускай кнігі і мастацтвам гравюры, дзякуючы якому на працягу вякоў ствараліся экслібрысы. «Як часта, узяўшы ў рукі старадаўнюю кнігу, мы не звяртаем увагу на адціснуты на вокладцы герб альбо не заўважаем прыклеенага з унутранага боку лістка з лацінскім надпісам "*Ex libris…*", то-бок "З кніг…", а яны могуць расказаць аб многім», — запэўнівае анатацыя.

Навінка Выдавецкага дома «Звязда» аформлена адпаведна заяўленай тэме. Вокладку выдання ўпрыгожвае своеасаблівы суперэкслібрыс, ролю якога выконвае кніжны знак беларускага вучонага Мікалая Каспяровіча, зроблены мастаком Яфімам Мініным у 1925 годзе. Вядома, гаворка не ідзе аб цісненні, з дапамогай якога ствараюцца сапраўдныя суперэкслібрысы, але ідэя счытваецца. Унутраны бок вокладкі аздоблены звычайнымі экслібрысамі — выкарыстаны работы нашых мастакоў Льва Алімава (1997) і Юрыя Якавенкі (2006).

З кнігі мы даведваемся аб тым, дзе і чаму з'явіліся кніжныя знакі, наколькі паспяхова яны спраўляліся з абаронай маёмасці ад крадзяжу, у каго з беларускіх палітычных дзеячаў мінулага на ўтрымманні была найбуйнейшая прыватная бібліятэка, з якіх крыніц папаўняліся яе фонды ды шмат іншых цікавых рэчаў. Ілюстрацыі, што суправаджаюць выданне, дазваляць прасачыць гісторыю развіцця графічнага мастацтва на працягу некалькіх стагоддзяў: «ад цяжкага і строгага барока» першых радзівілаўскіх знакаў да сучаснай гравюры.




*Экслібрыс бібліятэкі Іераніма Фларыяна Радзівіла.*

Паводле даследчыка Алега Судлянкова, экслібрысы, зыходзячы з іх зместу, падзяляюцца на пяць разнавіднасцей: геральдычныя, сюжэтныя, вензелевыя, шрыфтавыя і змяшаныя. Адпаведна, гісторыя беларускіх кніжных знакаў павінна «разводзіцца» па некалькіх асноўных напрамках: геральдычныя экслібрысы зборaў беларускай знаці і шляхты, уласніцкія знакі бібліятэк мяшчан і абывацеляў, знакі збораў навучальных устаноў і розных грамадскіх арганізацый, а таксама экслібрысы рэлігійных аб'яднанняў і служыцеляў культу.

Пералічаныя тэмы вынесены ў змест асобнымі раздзеламі. Дадаткова разглядаюцца традыцыі кніжных знакаў некаторых найбольш праслаўленых княжацкіх родаў, рукапісныя экслібрысы і экслібрысы XX стагоддзя. Па меркаванні Алеся Карлюкевіча, выданне Алега Судлянкова можна лічыць новым этапам у развіцці айчыннай экслібрысістыкі, дастойным працягам кнігі Аляксандра Шлюбскага «*Exlibris*'ы А. Тычыны», якая выйшла амаль сто гадоў таму (1928) і засведчыла зараджэнне цікавасці да кніжнага знака.

**Мікіта ШЧАРБАКОЎ**

# Мудрасць Усходу, прамоўленая па-беларуску

**Амар Хаям — велічыня сусветнага маштабу. Старажытны Усход ведаў яго ў першую чаргу як выдатнага навукоўца — матэматыка, фізіка, астранома, філосафа. У сучасным свеце ён больш вядомы як паэт, стваральнік арыгінальных філасофска-лірычных твораў. Яго творчасць мае глыбінны сэнс, таму з часам не страчвае актуальнасці. У Выдавецкім доме «Звязда» пабачыла свет выданне Амара Хаяма на беларускай мове. Кніга нарадзілася з ініцыятывы і дзякуючы фінансавай падтрымцы Пасольства Ісламскай Рэспублікі Іран у Рэспубліцы Беларусь. «Выбраныя старонкі» — гэта важкі, грунтоўны крок на шляху ўмацавання беларуска-іранскага сяброўства.**

Кніга змяшчае творы з літаратурнай спадчыны мысляра ў перакладзе Рыгора Барадуліна, Віктара Шніпа і Генадзя Аўласенкі. Беларускія пісьменнікі ў сваёй індывідуальнай аўтарскай манеры здолелі ўдала перастварыць рубаі іранскага паэта, перадаўшы мудрасць, глыбіннасць, філасофію, якія закладваў у свае вершы аўтар. Пра Амара Хаяма кажуць, што ён жыў адначасова ў двух вымярэннях — зямным і вышэйшым. Яго творы адпаведна і ўспрымаюцца. Суфійская паэзія, майстрам якой быў Хаям, характарызуецца асаблівай мовай, у якой словы акрамя звычайнага, вонкавага значэння маюць і іншае, значна глыбейшае.

Чытаючы вершы Амара Хаяма, можна атрымліваць асалоду ад іх павярхоўнага зместу і ўспрымаць даслоўна як гімн радасцям жыцця, прыгажосці, каханню. Аднак асаблівую цікавасць уяўляе чытанне вершаў на той мове, дзе словы змяняюць свой сэнс у залежнасці ад кантэксту і ад узроўню свядомасці чытача, дзе «ганчар», напрыклад, сімвалізуе творцу, «поўны збан» — меру чалавечага жыцця, «ружа» — увасабленне прыгажосці і пачуццёвай асалоды:

*А ганчар такі вылепіў чары галоў*
*І ганчарства ў майстэрства высокае ўзвёў,*
*Чару дном дагары над сурвэткай жыцця ён паставіў*
*І напоўніў гаркотай яе да краёў.*

Амар Хаям сцвярджаў, што чалавек пасля смерці трапляе ў іншы свет — вымярэнне, дзе няма месца клопатам, несправядлівасці, дзе пануюць эйфарыя і спакой. Паэт сваімі вершамі імкнуўся змяніць свет у лепшы бок, заклікаў жыць без смутку і болю, не клапатамі пра будучыню ці мінулае, а сапраўдным жыццём.




У вершах адсутнічаюць традыцыйныя шматпластовыя вобразы Усходу і іншасказальнасць. Наадварот, аўтар піша простай і даступнай мовай, выказвае думкі ў змястоўных выразах, не перагружаных сінтаксісам ці дадатковымі канструкцыямі. Сціславасць і зразумеласць — асноўныя стылістычныя рысы творчасці Амара Хаяма. Паэт выкарыстоўваў у вершах незвычайныя і арыгінальныя метафары, што надаюць ім пэўнай рамантычнасці. Мастацтва перакладу дазваляе зведаць мудрасць праз выдатна падабраныя беларускія словы, якія, здаецца, яшчэ больш чула і пранікнёна адлюстроўваюць сэнс твораў.

Каханне стала важным канцэптам у творчасці іранскага паэта. Яго адносіны да гэтага пачуцця часам былі палярнымі — ад захаплення каханнем і яго аб'ектам да глыбокага жалю, што яно часта руйнуе жыццё чалавека. Амар Хаям заўсёды станоўча, з павагай выказваўся пра жанчын, заклікаў шанаваць іх і рабіць шчаслівымі, бо для мужчыны каханая — найвялікшая каштоўнасць. Каханне і любоў для паэта — паняцці шматгранныя. Ён часта выкарыстоўваў паняцце «любоў», разважаючы пра сяброўства. Сяброўскія адносіны лічыў вялікім дарам: «Сябры, як разам нас збярэцца многа, давайце цешыцца красой адзін з другога...»

Філасофія паэта мае шмат падобнага з гуманістамі эпохі Адраджэння, дзе мэта творцы і вяршыня твора — сам чалавек:

*А мэта усяго тварэння — мы,*
*Вачэй спазнання азарэнне — мы,*
*Круг свету гэтага нібы пярсцёнак,*
*Дзе лепшы камень без сумнення — мы.*

Лірычны герой Амара Хаяма — гэта чалавек, які ставіць пад сумненне веру, радуе сябе, сціплы ў патрэбах і неабмежаваны ў магчымасцях розуму, глыбіні развагі. Разважаючы пра сэнс жыцця, Амар Хаям прыходзіў да высновы, што чалавек — госць гэтага свету на пэўны час, таму важна наталяцца кожным момантам, шанаваць дробныя радасці. Паэт лічыў, што мудрасць жыцця заключаецца ў прыняцці падзей, ход якіх ад цябе не залежыць, і ўменні вылучыць у гэтых падзеях станоўчыя моманты.

Дапоўніў «Выбраныя старонкі» сваімі графічнымі малюнкамі беларускі мастак азербайджанскага паходжання Каміль Камал. З дапамогай іх чытач зможа больш пранікнуцца светам усходняй мудрасці, філасофіяй слова.

Рубаі Амара Хаяма не страчваюць важкасці ўжо сотні гадоў пасля іх стварэння. Метафарычная і лёгкая мова, надзённасць тэм і агульны пасыл таго, што варта заўважаць прыгожае ў кожным дні, ставіцца да жыцця як да найвялікшага дару, — усё гэта важна і актуальна для чалавека XXI стагоддзя.

**Дзіяна КАЗІМІРЧЫК**



## Дзмітрый ДЗЕМІДОВІЧ

### Кветкі памяці

*Зноў расцвітаюць рамонкі ў палях,*
*Памяць вяртае ў былое.*
*Светлы агеньчык у мілых вачах —*
*Гэта святло залатое.*

*Вернецца, вернецца ўсё, што прайшло.*
*Збудзецца тое, што будзе.*
*І разальецца жывое цяпло.*
*Вецер любоў не астудзіць.*

*З неба глядзіць залаты маладзік,*
*З хітрасцю так пазірае,*
*Быццам сказаць хоча ён:*
*— Паглядзі,*
*Ночка якая святая!*

*Вернецца, вернецца ўсё, што прайшло.*
*Збудзецца тое, што будзе.*
*І разальецца жывое цяпло.*
*Вецер любоў не астудзіць.*

*Лёсам з другой звязан быў на гады,*
*Жонкай ты стала другога,*
*Толькі прыходзім з табою сюды —*
*Памяць, як сведка былога.*

*Вернецца, вернецца ўсё, што прайшло,*
*Збудзецца тое, што будзе.*
*І разальецца жывое цяпло,*
*Вецер любоў не астудзіць.*

### Коласаўскі шлях

*Уздоўж дарогі лес сасновы,*
*Бярозак купкі іншы раз,*
*А дрэвы ў восеньскіх абновах*
*Стаяць, нібыта напаказ.*

*Іду я «Коласаўскім шляхам» —*
*Навокал ціша і спакой.*
*А нада мною неба дахам,*
*Бусловы клёкат нада мной.*

*Стаяць драўляныя скульптуры.*
*Давайце трохі памаўчым!*
*Героі твораў на натуры*
*З кніг выйшлі, быццам адпачыць.*

*Стаіць Міхал у задуменні,*
*А побач — смешнае дзіця.*
*Застылі вечнасць і імгненне*
*У непаўторнасці жыцця.*

*І ўюцца пчолкі ў «Пчол падглядзе»,*
*А Ганна ў клопаце сваім*
*Заўжды падкажа і дарадзіць*
*Малодшым дзеткам і старым.*

*Гляджу на лес у прыгажосці,*
*На твары постацей жывых.*
*Як добра, што я тут не госцем,*
*А, як зямляк, сярод сваіх.*

*Душа ж у нейкім прадчуванні*
*Сустрэчы з чым ці, можа, з кім…*
*Я закаханы светлым раннем*
*У родны край мой на вякі.*

*Мне з ім ніяк не развітацца —*
*Няма ні кропелькі маны.*
*І нездарма ж мне ноччу сняцца*
*Аб родным краі кветкі-сны.*

### Апаленая памяць

*Шумяць вершалінай таполі.*
*Падняўся асіннік, ліпняк.*
*Раней было чыстае поле,*
*Але не жытнёвае поле,*
*А поле ваенных атак.*

*Акопы зраўняў час з зямлёю,*
*Але дзіраван злёгку капні —*
*Накатаў бярвенне гнілое*
*Адбіткам далёкага бою,*
*І памяць апаляць агні.*

*І выстраліць памяць прыцэльна,*
*Ды выхапіць раптам фрагмент,*
*Нібыта і сам ты удзельнік*
*Той жудаснай бойкі, смяротэльнай —*
*Бы кадры ад кіналент.*

*Шумяць верхавінай таполі,*
*Глядзяць на шашу — светлы шлях.*
*Няхай жа ніколі*
*Тут міны не рвуцца на полі,*
*Не гінуць салдаты ў баях.*

### Неба

*Зверху падала хісткае неба,*
*Пралівалася цёплым даждждом,*
*Каб пасля стаць вясною і хлебам,*
*Гронкай бэзу над мілым акном.*

*А затым запалала вясёлкай —*
*Разнаколерным яркім святлом,*
*Што свяціла над родным пасёлкам*
*Паўкаронаю і паўвянком.*

*І глядзіш ты, як зачараваны,*
*На прыроды святую гульню,*
*На дзівосны міраж без падмана,*
*На нябёс незвычайнае «ню».*

*Сам святлееш душою і целам.*
*І ўсе мроі — адна чысціня.*
*І на ўсім свеце Божым і белым*
*Не знайсці мне найлепшага дня.*

---



## Кацярына ЯНЧЭЎСКАЯ

# Гукі сонцастаяння

### Небасхіл

*І белая зіма, і лініі жыцця.*
*Прастора сэрца абдымае словы.*
*І лініі гучаць сусветамі размовы,*
*рамонкамі ў снезе адкрыцця.*
*І лініі плывуць валошкамі прадмесцяў,*
*лілеямі з карцін дзівосных мастакоў.*
*…Алоўкам белым на паперы чорнай*
*ты пакідаеш голас свой,*
*зіма.*

### Шматгалоссе

*Заблытаўся ў шэрым*
*снежань.*
*Сонца — абрысы маскі*
*з аркамі старых паркаў.*
*Драўлянай званіцы*
*госці —*
*гіль і сініца —*
*шукаюць свае шматгалоссе*
*ў сланечнікавых прыгодах.*
*Сонца ў сардэчных скляпеннях —*
*алей для лампады.*
*У шэрым трымценні*
*снежань*
*шукае*
*святло Раства.*

### Календула

*Замаразкі.*
*Іспыт:*
*Зберагчы цеплыню*
*Да наступнага лета.*
*Да наступнага пытання*
*Пра сутнасць цеплыні.*
*Яскравую календулу*
*Прыкладвае*
*Да сваіх мазалёў*
*Мароз.*
*Хуткаплынны каляндар —*
*Terra incognita.*

* * *

*Стыхія чакання —*
*Віртуозная чапля*
*На востраве*
*Колкай шэрані.*
*Панцыр чакання —*
*Сыравіна віны і палёту.*
*Кантрасты*
*На фоне падманнага «мы».*
*Невад. Чаканне.*
*…Птушка злавіла*
*Рыбу*
*Ў возеры нематы.*

* * *

*Завея памяці.*
*Залежнасць ад самоты.*
*Ільдзінкі Іль-дэ-Франс*
*У музычнай Лідзе.*
*Правобразы на востраве*
*жывуць.*
*Вуліцы*
*старога горада*
*іграюць*
*вінаградным костачкай*
*на целе*
*віяланчэлі…*
*У гуках — прарадзімы бег.*

### Ледзяны сум

*Немагчыма акрэсліць межы*
*таго рэчыва, што ліецца*
*скрозь раніцу болю.*
*Пранізлівыя абрысы.*
*Пранізлівыя аскепкі.*
*Пранізлівыя сустрэчы.*
*Грукат. Патрэсквае лёд на вуліцы.*
*Патрэскваюць хмары ў печы.*
*На беразе ўласнай раны*
*немагчыма азірнуцца*
*на далягляды,*
*бо рана — твае суцэльнае,*
*маленькае, нямоглае «я»,*
*твая раніца,*
*што гуляе вострымі льдзінкамі*
*на паверхні*
*ўсходу сонца.*
*Незнаёмае нешта ўдалечыні*
*працінае сутонне цела.*
*Зімовае сонца на скронях.*
*Стыхіра малення.*

---



## Яўген ГУЧОК

# Многа слоў у чалавецтва

* * *

*Як многа слоў у чалавецтва,*
*Як мала ў яго душы…*
*Паэт, імкніся з небам быць у спаемстве,*
*І менш заземлена пішы.*

* * *

*Ні на гады,*
*Ні на вякі*
*Крапаюць вершаняты —*
*Чарвякі.*

* * *

*Нецікавым у часы нецікавыя*
*Вельмі цікава жывецца;*
*Божа, а цікавым,*
*Дзе ім падзецца?!*

* * *

*З Богам на словах… —*
*Такіх надта многа,*
*А з Богам у душы…*
*Дзе ты, нябога?!*

* * *

*Карысным выкапням неба*
*Месца ў душы чалавека;*
*Зямлі карысным выкапням*
*У страўніку месца ад веку.*

* * *

*Ад празмернае*
*Апекі*
*Множацца маральныя*
*Калекі.*

* * *

*Няма ў маёй хаце такога смецця,*
*Якое людзі выносяць у свет,*
*Жыву ў адзіноце, але не ў сакрэце,*
*І ўсё ж я — нібыта анахарэт.*

*А вы, дарагія мае ягамосці,*
*Прыходзьце ў хату маю і выносце*
*Зоркі начныя мае і сонечны вецер,*
*Даўно ўжо чаканыя і ў Сусвеце.*

### Чалавек

*Маці яго — Прырода,*
*Бацька яго — Бог,*
*Не існуюць яны паасобна,*
*А толькі ў спаемстве — утрох.*



Фота Кастуся Дробава.

# Кавалёў сшытак

*Вясковінкі*



Вінцук САРБЕЎСКІ

Павячэралі. Кот няспешна мыецца на гасцей. Мама аглядае мае чаравікі. Незадаволена ставіць на месца, кажа бацьку:

— Рады няма з гэтым абуткам: што ні купі, усё пакрывіцца. Трэба, мусіць, хлопца да каваля звадзіць.

Бацька дарабляе свае справы, корпаецца ў скрыні з інструментам:

— Чаму не звадзіць, зваджу. Заўтра і пойдзем.

Хоць я побач, сяджу на табурэтцы, хітаю босымі нагамі — на мяне ніхто не зважае. Усё адно як забыліся, што іх хлопец тут.

Чаравікі былі куплены бабуляй. Аднойчы раніцай старая паклікала мяне, дзелавіта пасадзіла на зэдлік. Узяла з кута венік, выламала трэску, прыклала да падэшвы. Падраўняла, лішняе адрэзала. Са знятай меркай адправілася ў горад купляць падарунак унуку. Вось бабуліна абноўка, зношаная дачасу, і перапоўніла бацькоўскае цярпенне.

Не раз, калі мама ўкладвала мяне спаць, лёгенька пастуквала пальцам па пятцы і прыгаворвала: «Кую, кую ножку, паеду ў дарожку…» Але ж гэта такая дзіцячая забаўка перад сном. Каб ногі хуценька схаваліся пад коўдру. Навошта ж ісці да каваля, ды яшчэ з чаравікамі?

На кухні я сядзеў моўчкі, занурыўшыся як шашок. Пазней перапытаў:

— Мама, а чаму да каваля? Што ён будзе рабіць?

— Ды што ён звычайна робіць? Возьме малаточкі розныя, ножкі моцна заціснe. Дзе крывенька — падстукае, падаб'е, выпрастае. Чаравікі будуць доўга насіць.

Розныя малаточкі мяне зацікавілі. А калі гэта будзе не горш за «Кую, кую ножку», то чаму не схадзіць:

— Добра, пайду да каваля. Няхай раўняе.

Адзін раз, не падумаўшы, я ўжо даў згоду. Калі захварэў, мама адвяла ў вясковую паліклініку. Там таксама было шмат цікавага, што магло б стаць маімі цацкамі.

Доктар уважліва агледзеў, выслухаў халоднай бірулькай: «Застаяцеся!» А якое там «застаяцеся», калі бацькам трэба на працу, старэйшыя ў школе, а бабуля гасцюе ў цёткі. Мама ўгаворвае пару дзён пабыць самому ў бальніцы, абяцае, што мяне ўсе будуць адведваць. Ацаніўшы доказы, я пагадзіўся: «Так, трэба падлячыцца».

Белыя халаты падзівіліся з малечай сур'ёзнасці, заўсміхаліся, а мама — не. І не памылілася. Як толькі застаўся ў палаце адзін з чужымі людзьмі, ад ранейшай упэўненасці не засталося і знаку. Галасіў нема. Ніхто не мог суцешыць маё гора-горачка, гора горкае.

…Раніцай, на другі дзень пасля гаворкі пра паход да каваля, я ўжо тузаў матчыну спадніцу:

— Мама-а-а.

— Што, мой сынок?

— Нешта мне сёння не хочацца.

— Чаго табе не хочацца?

— Да каваля ісці.

Прыселі, пагаварылі. Мама расказвала, як бабуля старалася зрабіць мне прыемнае, ашчаджала пенсію. Успомніла як яна сама, калі была малая, радавалася рэдкім абноўкам і вельмі шанавала іх. Ставіла ў прыклад маіх старэйшых. Я паабяцаў, што буду насіць чаравікі акуратна.

А ў той дзень яны і не спатрэбіліся. Гоцалі з катом па хаце. Абдзіраліся мае рукавы і рукі…

* * *

Каваля я ніколі не бачыў. Нават імені яго не чуў. Каваль і каваль — ніяк інакш. Ведаў, жыве на ўскраіне вёскі. Хадзіў з бацькам той вуліцай. Яго хата стаяла воддаль ад дарогі, за прысадзінамі не разгледзець. Агародчык заўсёды засеяны пшаніцай. Пад яблынямі віднелася некалькі вулляў.

Быў там і мясцовы стораж, сустрэцца з якім аднаму было боязна. Ён распушваў крылы, на дзюбу навісаў наліты крывёю чарвяк. Пярэстая гурба пер'я і злосці шыпела і накочвалася на цябе.



*Фота Кастуся Дробава.*

З дарослымі не так страшна. Бацька навучыў побач з гэтым пудзілам свістаць. Зачуўшы гук, яно кожны раз выцягвала шыю і няўцямна бурбатала, трасучы агаленым воллем: «Здароў, здароў, здароў…»

* * *

Пчол у нашай вёсцы мала хто трымаў. Мёд быў ласункам. Той, што з крамы, — зусім не такі, але вельмі смачны. Рэдзенькі, льецца са слоіка цурком. Так прыемна злізваць яго з металічнай накрыўкі, упрыгожанай залацістымі разводамі.

Калі я моцна прастыў, мама кінулася здабываць гаючыя лекі. Толькі ў каваля ўдалося прыдбаць трошкі мёду. Прынесла сваю каштоўную здабычу ў выглядзе шэра-жоўтага камяка на лыжцы, закручанай у газету…

З крамным не параўнаць. Занадта церпкі, казытлівы. Але ж трэба лячыцца і не расстройваць маці.

* * *

Толькі адзін чалавек, прыехаўшы ў нашу вёску, заўсёды спыняўся побач з кавалёвай сядзібай. Ён прывязваў свайго нягеглага каняку, браў з воза пакункі ды шыбаваў з імі ў хату за прысадзінамі і вуллямі.

Звалі яго Каўтун. Гэта было не сапраўднае імя, а вясковая мянушка. Прыляпілася яна невыпадкова. Чужынец ніколі не стрыгся, збітыя валасы звісалі чорнай капной на плечы. Давяршалі шалёнае ўбранства густая барада і вусы. Вастрэйшыя на язык вяскоўцы параўноўвалі іх з грывай і хвастом з'езджанага памочніка. Гаспадар выйграваў гушчынёй і насычаным колерам воласа: «Хоць цяпер стаў у аглоблі замест дахадзягі. Не адна кабыла на яго азірнецца».

Каўтун быў анучнікам. Праца такая. Час ад часу аб'язджаў навакольныя вёскі, збіраў старое рыззё і металалом, расплачваўся накрыўкамі для закатак. Можа, яшчэ чым, але дзятве былі важныя толькі семкі, якія адразу перакульваліся чорным россыпам са шклянкі ў кішэню.

Гэтыя прысмакі нідзе не прадаваліся. А на агародзе сланечнікавыя галовы хоць і вырасталі часам з рэшата, але ніколі не даспявалі да належнай кандыцыі. Мяккія семкі, як ні падсушвай, не лузгаліся.

Да чарговага прыезду анучніка дзеці загадзя, у схаваных ад чужых вачэй месцах, складвалі прыцягнутае адусюль ламачча. Анучнік усё не браў, прыдзірліва перабіраў, нявартае вяртаў без жаданай узнагароды.

Каваль быў вельмі патрэбны Каўтуну. Каня ж трэба падкоўваць, а хто гэта зробіць? Няма спецыялістаў. І кузні няма. Калгасная пабудова яшчэ стаяла, але ў ёй засталіся толькі халодны чорны прысак, крануты шэранню, ды рэшткі астылай курадымнай печкі.

Пасля анучнікавых візітаў знойдзеныя падковы ўспрымаліся няйнакш як «Каваль зрабіў, Каўтун згубіў». А яшчэ вясковыя бабулькі пагаворвалі пра чары і наказвалі дзецям такія знаходкі дамоў не прыносіць.

* * *

Старэйшыя закончылі школу, раз'ехаліся хто куды. Таму незнаёмы вучнёўскі сшытак на кухні, за шклом буфета, быў успрыняты мной з асцярогай і рэўнасцю. Аказалася, ніхто на мае папяровыя запасы не пасягаў.

Кузні не было, але каваль выконваў некаторыя калгасныя заказы на сваёй сядзібе. Пра зробленае трэба было напісаць справаздачу, для якой і спатрэбіўся сшытак. У маю адсутнасць каваль зайшоў да бацькі, папрасіў перадаць у бухгалтэрыю вынікі сваёй працы.

Як жа не пацікавіцца гэтымі запісамі? Сшытак, вызвалены з-за шкла, ужо ў маіх руках. Спрабую чытаць і спыняюся, бо нічога не разумею. Перагортваю, шукаю больш падатлівыя радкі. Старонкі густа ўсеяны пісьмёнамі. Ні косак, ні кропак. Злуюся на сябе і на аўтара: «Настаўніца двойку паставіла б за такое дамашняе заданне».

Толькі з падказкі бацькі пачынаю штосьці кеміць. За гэтымі густа сплеценымі і слаба чытэльнымі словамі — кожны, самы драбнюткі этап працэсу. Але як гэта ўсвядоміць, а тым больш запомніць, калі не даводзілася бачыць нічога падобнага.

Слова *кавадла* чуў яшчэ тады, калі бацькі збіраліся раўняць мне ногі. Бачыў і маленькае падабенства. Колькі разоў назіраў за тым, як тата кляпаў касу. Прылада няхітрая, завецца *бабкай*, мацуецца да калоды. Вось на яе і кладзецца каса, а па ёй шчыльным паяском па самым краі выстуквае малаток. Пошчак ідзе па ўсім двары, па ўсёй вуліцы, аддаецца ў вушах.

А тут? Што ні слова, то загадка — сядзі і разбірайся. Але і магчымасці такой няма. Адзін сшытак знікае (бацька адносіць яго ў бухгалтэрыю), з'яўляецца другі, потым трэці.

Маё рэгулярнае шмыганне на табурэтцы каля буфета хутка было заўважана бабуляй. Там у яе мелася свая схованка. Старая прыняла гэта за найвышэйшы знак. Калі бацькоў не было дома, даставала з шуфлядкі свае запісы, надзявала акуляры, клікала ўнука і пачынала нараспеў чытаць...

У мяне ўжо сабралася свая невялічкая бібліятэка. Кнігі купляліся, дарыліся блізкімі і сябрамі. Пабыўшы некі час любімцамі, адны адсоўваліся далей, іх месцы заступалі новыя. Але гэты ланцужок хатняга чытва не мог сапернічаць з кавалёвымі запісамі.

Часам падключаўся бацька, пасміхаўся: «У бухгалтэрыі разбяруцца, там за проста так грошай не налічаць». Нешта паказваў на сваіх інструментах. Штосьці памятаў з даўніх візітаў у кузню, часоў падлеткавай захопленасці кавальскай дужасцю і падатлівасцю распаленага дачырвана жалеза.

У сям'і пачалі прыгадваць, што і клямкі ў старой дзедавай хаце зроблены кавалём, і завесы, і абручы на кадушках, і шмат іншай драбязы. Агароджа па дзеду ім майстравалася: «Гэта ж так прасілі і столькі давялося чакаць, усё часу не меў».

Бабуля праз вільготныя вочы згадала заручальныя пярсцёнкі, выбітыя з манет. Не кавальскае рамяство, але ж работа таксама з малатком. І памяць пра маладосць: «А мае ж вы дзеткі, а што ж вы думалі. Даўней так замуж ішлі. Дзе ты дакупішся? А яшчэ ж трэба на працы, наткаць усяго: без пасагу ніхто не возьме».

Потым кавалёвы сшыткі перасталі з'яўляцца ў нашай хаце. Як і не стаялі яны за шклом буфета. Няхай гэтыя пісьмёны так і не былі расчытаны. Засталося прыемнае адчуванне, што я, на зайздрасць сябрукам, трымаў у сваіх руках незвычайную таямніцу.

Схіленыя над кавалёвымі запісамі галовы шмат чаго ўспомнілі. Абуджаныя старонкі мінулага з цікавасцю перагорталіся ва ўяўным сямейным альбоме. Многае са згаданага ўдакладнілася, упарадкавалася. Бацька казаў: «Счапілася — як смаляной дратвай сшытае».

# У пошуках справядлівасці

**У канцы 1920-х гадоў кніга замежнага аўтара, якая выходзіла ў Мінску, апынался адразу ў двух кантэкстах — рэспубліканскім і дзяржаўным, а таксама ў агульнай мультыкультурнай сістэме і з адзіным эпіцэнтрам беспрэцэдэнтнага сацыяльнага эксперыменту. Працэс гэты не быў спарадычным. Гасцявая пісьменніцкая «віза», як правіла, давалася ў выпадку адпаведнасці творчасці канкрэтнага аўтара ідэйна-эстэтычным прыярытэтам маладой Краіны Саветаў.**

## Ад надзённасці да вечнасці

Публікуючы матэрыялы да 100-годдзя Івана Цанкара, часопіс «Иностранная литература» (1976, № 5) наступным чынам рэпрэзентаваў шаноўнага юбіляра: «Яго шырокая творчасць — проза, драматургія, публіцыстыка, літаратурная крытыка, паэзія — прасякнута духам барацьбы супраць сацыяльнага і нацыянальнага прыгнёту, глыбокай, трапяткой чалавечнасцю і аднячана высокай мастацкай дасканаласцю».

І яшчэ адна вытрымка з часопіснага тэксту, што непасрэдна выводзіць нас на патрэбны твор: «Яго іранічны, горкі талент адкрыў новую старонку ў славенскай літаратуры. Ён нёс з сабой адчай і праклёны тых, хто з жахам думае пра заўтрашні дзень, чыю чалавечую годнасць гняце і ламае самазадаволены буржуа. Ён гаварыў аб пратэсце, які спее ў нетрах цёмнага царства, аб пад'ёме народных мас (аповесць "Батрак Ернэй і яго права", 1907)».


З фондаў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі.


*Ян Цанкар «Праўда батрака». Масква, 1929 г.*

Сярод найбольш значных выданняў Івана Цанкара — раман «Марцін Качур. Жыццяпіс аднаго ідэаліста» («Martin Kačur. Življenjepis nekega idealista», 1907), зборнікі апавяданняў «Віньеткі» («Vinjete», 1899), «Кніга для легкадумных людзей» («Knjiga za lahkomiselne ljudi», 1901), «Вобразы са сноў» («Podobe iz sanj», 1917), камедыі «Для народнага дабрабыту» («Za narodov blagor», 1901), «Кароль Бетайновы» («Kralj na Betajnovi», 1902) і інш.

Аповесць «Батрак Ернэй і яго права» («Hlapec Jernej in njegova pravica», 1907) — адзін з ключавых момантаў біяграфіі аўтара. Прытым не толькі творчай. У 1907 годзе Іван Цанкар балаціраваўся на выбарах у аўстра-венгерскі парламент ад сацыял-дэмакратаў Славеніі, шмат выступаў перад рабочымі. Пралетарыят дружна падтрымліваў свайго вылучэнца. Але перамогу атрымаў кандыдат ад народна-прагрэсіўнай партыі, найбольш папулярнай у куды больш шматлікім сялянскім асяроддзі.


Фота з сайта dlib.si

*Іван Цанкар (Ivan Cankar). Пачатак XX ст. Фота Аўгуста Бертальда (Avgust Berthold).*

У напружаныя дні канкурэнтнай барацьбы ўзнікла задума самага вядомага твора Івана Цанкара, перакладзенага на многія еўрапейскія мовы, — аповесці «Батрак Ернэй і яго права». «Хацеў напісаць агітацыйную брашуру да выбараў, атрымалася мая найлепшая навела», — прызнаваўся пісьменнік.

Пры вызначэнні жанру твора выдаўцамі і літаратуразнаўцамі апрабаваны шырокі спектр вызначэнняў: апавяданне, аповесць, раман і інш. Думаецца, найбольш карэктнай будзе гаворка пра своеасаблівы жанравы сінкрэтызм, паколькі традыцыі народнага эпасу ў названым творы таксама прасочваюцца.

Пасля сарака гадоў парабкавання Ернэй выпраўджаны з заможнай сялянскай сядзібы ў белы свет. Пакрыўджаны на маладога гаспадара, ён ідзе шукаць праўду ў старасты, суддзі, святара, імкнецца трапіць і да самога імператара. Наіўнае хаджэнне героя паўсюль суправаджаецца кпінамі, смехам, арыштам. Ернэй вяртаецца ні з чым, падпальвае драўляныя пабудовы, а раззлаваны люд кідае яго самога ў полымя пажару.

Так выглядае кароткі змест твора, сюжэт якога добра нам вядомы па псеўдафальклорных, але пры гэтым хрэстаматыйных казках савецкага перыяду, у якіх пошукі праўды ў дакастрычніцкі час вядуцца селянінам, рабочым, салдатам (у розных варыяцыях герояў).

## Славянская гаспода

Гістарычнай адметнасцю на шляху беларуска-славенскага культурнага спазнання ў XX стагоддзі была пастаянная змена грамадска-палітычных парадыгм, рухомае месца ў іх нацыянальнага складніка: самаідэнтыфікацыі, мінарытарнасці (меншасці), аб'ектна-суб'ектных узаемадачыненняў і інш.

Пасля Першай сусветнай вайны, распаду Аўстра-Венгерскай імперыі (1918) адным з новых дзяржаўных утварэнняў на яе былой тэрыторыі стала Каралеўства сербаў, харватаў і славенцаў (з 1929 года — Югаславія). Пасля Другой сусветнай Югаславія ўжо не каралеўства, а федэратыўная дзяржава, у склад якой уваходзіць шэсць рэспублік: Сербія, Харватыя, Славенія, Македонія, Чарнагорыя, Боснія і Герцагавіна.

Паводле згаданай вышэй юбілейнай публікацыі ў часопісе «Иностранная литература», Іван Цанкар у Савецкім Саюзе 1970-х гадоў рэпрэзентаваўся як *югаслаўскі славенскі пісьменнік*. Дзякуючы перакладам Ніла Гілевіча ў гэты час у Беларусі ён паўстае ў іпастасі перыяду сваёй няўрымслівай маладосці. На творчым рахунку славенскага аўтара першы і адзіны паэтычны зборнік — «Эротыка» (1899), які прадстаўляе яго ў кантэксце нацыянальнай «мадэрны», генерацыі пакалення канца XIX — пачатку XX стагоддзяў, якое ўзяло курс на радыкальнае абнаўленне вобразна-выяўленчага арсенала айчыннага мастацтва. У зборніку «Маці мая, Славенія. Выбраныя старонкі славенскай паэзіі XIX—XX стагоддзяў» (1976) змешчаны тры вершы Івана Цанкара: «***Ты прайшла ля маёй хаты міма», «***Дзе і калі маладосць прамільгнула?», «Урачыстасць у Варшаве. (На адкрыццё помніка Міцкевічу ў 1898 г.)».

У гісторыі беларускай рэцэпцыі славенскай прозы назіраецца прабел больш чым у палову стагоддзя. Аповесць «Батрак Ернэй і яго права» ананімна перакладзена ў 1929-м. Наступныя выданні кніжнага фармату з'явяцца ў Мінску пры паўнамоцным культурным пасрэдніцтве Івана Чароты: творы Бены Зупанчыча (1983), Ёсіпа Юрчыча (1986), Драгі Янчара (1990).

## Масты і кладачкі дружбы

Напрыканцы 1920-х гадоў славенская літаратура патроху асвойваецца на беларускіх землях па абодва бакі дзяржаўнай мяжы. У Заходняй Беларусі гэтаму спрыяюць студэнты чэхаславацкіх ВНУ. «Еўропа ў мініяцюры», як называлі ў той час рэспубліку, што ўзнікла на адным з адломкаў Аўстра-Венгрыі, прымае ў сваіх навучальных установах выхадцаў і з былой Расіі, і з сучаснай Югаславіі. Дзякуючы энтузіязму актыўных прадстаўнікоў новай генерацыі творчай моладзі наладжваецца культурнае, навуковае супрацоўніцтва. Беларуска-славенскі дыялог, у яго спрадычных праявах, развіваецца ў кантэксце маштабнага полілогу.

У лютым 1928 года ў некаторых гарадах і вёсках Славеніі і Харватыі арганізуюцца «Вечары Беларусі». Летам 1930 года Віленскі край наведаў Ян Шэдзівы. Францішкам Грышкевічам пераствораны і апублікаваны ў заходнебеларускім друку асобныя вершы Отана Жупанчыча, Сімана Енкі, Станкі Враза.

На старонках «Полымя» (1929, № 2) змешчаны артыкул Р. Кальтофэна «Сучасная Юга-Слаўская літаратура» (захоўваем правапіс часопіснай публікацыі). Мяркуем, гэта пераклад; асобу аўтара, як і першакрыніцу, яшчэ належыць высветліць. У агульным мастацкім кангламераце народаў разгледжаны шляхі развіцця дзвюх дамінантных нацыянальных плыняў — сербскай і харвацкай. Са славенскай літаратуры аўтарам прыгаданы толькі Отан Жупанчыч — лірык і перакладчык Шэкспіра.


Фота з сайта dlib.si


*Іван Цанкар «Батрак Ернэй і яго права». Любляна, 1907 г.*

Асобным выданнем і тыражом у 15 тыс. экзэмпляраў у тым жа годзе ў Мінску выйшла аповесць Яна Цанкара «Праўда батрака». У дачыненні да гэтага факта літаратурных паразоваў гаворку трэба весці не пра наўпроставы дыялог, а пра культурнае пасрэдніцтва, прытым шматмоўнае і пройдзенае праз шэраг этапаў.

За некалькі гадоў перад гэтым выйшлі тры пераклады на рускую мову. У 1927 годзе ў маскоўска-ленінградскім «Госиздате» пабачыў свет раман (!) Яна Цанкара «Бартола і яго права» ў перакладзе *Л. А. Шереметьева* і прадмовай *Л. А. Ш.-Леля*. Мяркуем, за адрознымі прозвішчамі стаіць адна асоба інтэрпрэтатара, фрагментарныя звесткі пра якую ўдалося выявіць толькі на сайце «Вернутыя імёны. Кніга памяці Расіі».

Леанід Шарамецьеў (1907—1937) пэўны час вучыўся ў чэхаславацкай Горнай акадэміі, потым перабраўся ў СССР, жыў у Ленінградзе. Лёс гэтага чалавека — толькі адна з сюжэтных ліній у агульных плынях расійскай эміграцыі, зменавехаўства, савецкай славістыкі 1930-х гадоў.

Паводле назвы ўказанай першакрыніцы («Hlapic Jernij in nyegova pravia»), што ўяўляе сабой славенска-чэшскі моўны мікс, пераклад Л. Шарамецьева зроблены не з арыгінала, а з пражскай інтэрпрэтацыі, якая ў сваю чаргу арыентавалася на італьянскую рэцэпцыю, — на гэта ўказвае і зменены імя галоўнага героя — Бартола.


З фондаў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі.


*Ян Цанкар «Праўда батрака». Мінск, 1929 г.*

Адзін з перакладаў аповесці Івана Цанкара выйшаў у 1929 годзе ў выдавецтве «Земля и фабрика» (Ленінград — Масква). Імя інтэрпрэтатара не ўказана, але нельга не адзначыць тыраж выдання — 35 тыс.; у пераўвасабленні Шарамецьева твор выйшаў у 5 тыс. асобнікаў.

Пераклад Пятра Ахрыменкі пабачыў свет у выдавецкім таварыстве «Огонек» (Масква, 1929; 30 тыс. экз.), менавіта на яго і арыентаваўся неназваны беларускі інтэрпрэтатар. Да такой высновы мы прыйшлі ў ходзе тэкстaлагічнага аналізу. Ранейшыя працы славенскіх даследчыкаў пераканаўча даказалі, што перастварэнне П. Ахрыменкі зроблена не са славенскага арыгінала, а з англійскага пасрэдніка. Імя героя тут гучыць ужо як Эрні.

Кожны з названых фактаў культурнага супрацоўніцтва, зафіксаваных у перакладчыцкай і кнігавыдавецкай дзейнасці, варты асобнага даследавання. Не толькі тэксты, але і вокладкі, ілюстрацыі розных выданняў аповесці класіка славенскай літаратуры сведчаць аб адметных прыкладах мастацкай рэцэпцыі, адпаведнай часу і грамадскім запытам.

**Мікола ТРУС,**
**кандыдат філалагічных навук**

# Да шостага акіяна

Няма такога паэта, які б не прысвячаў твораў сваёй малой радзіме. Не выключэнне і Мікола Гамолка. У адным сваім вершы ён так прызнаецца ў любові да яе:

*У ёй крышталь-вада.*
*Майго дзяцінства ты сталіца —*
*Далёкая Найда.*
*Яна пры возеры чароўным*
*На берагах яго стаіць.*
*Тут звоняць ланцугамі чоўны*
*Пад крыллем зараніц.*

Сёй-той здзівіцца: Мікола Гамолка — паэт? Ён жа быў празаікам. Што праўда, то праўда. Аднак празаікам стаў пазней, выдаўшы два паэтычныя зборнікі. Не ў Найдзе, што ў Жыткавіцкім раёне, нарадзіўся 11 сакавіка 1922 года, ў Брынёве Петрыкаўскага раёна. Але калі яму споўнілася ўсяго два гады, памерла маці. Яшчэ праз тры вясны бацька завёў новую сям'ю, прыстаўшы ў прымы да ўдавы ў Найдзе.

Памяць пяцігадовага Міколкі назаўсёды захавала пярэбары ў Найду, пра што Мікола Іванавіч пісаў у аўтабіяграфіі «Мой шлях»: «Падвода, нагружаная сялянскім скарбам, паволі валюхаецца па вузкай і змрочнай дарозе. А абапал — лясы, лясы, лясы… Такі наш край, славутае Палессе». Са сталеннем усё больш упэўніўся ў гэтым. Шукаць прыгажосць не трэба было, яна паўставала поруч з хатай, што стаяла воддаль ад вёскі, каля самага лесу. Непадалёку знаходзілася і возера, таксама Найда. Не такое і вялікае, ды на беразе яго так хораша марылася. Асабліва ў маленстве.

Ці не гэтае захапленне паспрыяла таму, што, калі настаўнік Рыгор Мультан прапанаваў вучням напісаць сачыненне на вольную тэму, у яго зусім і не сачыненне атрымалася, а «сапраўднае мастацкае апавяданне». Прынамсі, так ацаніў педагог тое, што з'явілася з-пад пяра найбольш стараннага чацвёртакласніка. У раннім узросце ён і вершы пачаў пісаць. Хоць часам і не да іх было. Сям'ю не мінулі нягоды калектывізацыі. Толькі не пакідала вера ў тое, што ў далейшым усё будзе лепш. Таму і нараджаліся радкі светлыя, аптымістычныя. У нечым і далёкія ад рэчаіснасці. Ды такі быў час, калі і вопытныя паэты нярэдка жаданае выдавалі за сапраўднае, а што ў такім разе казаць пра рамантычнага юнака. Пісаў і допісы ў раённую газету «Новае Палессе», іх ахвотна друкавалі.

**Стаўшы адным з першапраходцаў касмічнай тэмы ў беларускай літаратуры — следам за «Фантамабілем прафесара Цылякоўскага» Янкі Маўра і творамі Уладзіміра Шыціка, ён належаў і да тых, хто адным з першых пачаў плённа асвойваць прыгодніцкі жанр у дзіцячай літаратуры. Пачатак гэтаму паклаў аповесцю «Дзяўчына ішла па вайне». Але большы рэзананс мела «Лясная крэпасць», заснаваная на рэальных фактах, што мелі месца ў гады Вялікай Айчыннай вайны каля возера Чырвонае Жыткавіцкага раёна.**

Гэта не магло не радаваць. Але з прычытаннем кожнага чарговага нумара прыходзіла і расчараванне. Дасылаў жа і вершы, але ніводнага з іх у газеце не бачыў. Як кажуць, ні прывітання, ні адказу. «Ну, думаю, — вырашыў хлапец, — пашлю ў раёнку цэлы цыкл вершаў. Не можа таго быць, каб цяпер яны не спадабаліся рэдактару. Толькі адказу не было. Вершы як скрозь зямлю праваліліся. Ды месяцы праз два ў вёску на маё імя нечакана прыходзіць важкі пакет. Калі распячатаў, нямала здзівіўся. Гэта былі мае вершы, што былі дасланы ў нашу райгазету».



Мікола Гамолка.

Што вярнулі — непрыемна. Ды дагэтуль нічога падобнага не назіралася. Паслаў верш — на гэтым усё скончылася. Праз імгненне стала вядома, што і да чаго: «Калі адгарнуў другую старонку ліста, вочы асляпіў подпіс: "З прывітаннем Якуб Колас". Ого, аказваецца, рэдакцыя маімі вершамі патрывожыла народнага паэта Беларусі, паслала іх як бы на экспертызу». Здзівіўся — не тое слова. Народны пясняр не проста прачытаў яго творы, але і падрабязна прааналізаваў іх, даў парады. Не паленаваўся і ўласнаручна чырвоным алоўкам напісаў адказ. Усё жыццё Мікола Іванавіч перажываў, што гэты водгук Якуба Коласа згубіўся ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

Першыя яго вершы былі надрукаваны ў 1937 годзе. Адзін з іх — «Вясёлы сад» — у «Піянеры Беларусі». Два — у бабруйскай акруговай газеце «Камуніст». У Бабруйску ён вучыўся пасля заканчэння сямігодкі, а сярэднюю адукацыю атрымаў у Жыткавічах. Пашчасціла трапіць і на старонкі рэспубліканскай «Чырвонай змены». Гэтыя публікацыі не прайшлі незаўважанымі. У 1938 годзе Міколу Гамолку запрасілі на творчы семінар, што праходзіў у Мазыры. Там пазнаёміўся з таксама маладымі на той час літаратарамі Усеваладам Краўчанкам і Іванам Мележам.

Калі праз год паступіў у Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, знаёмцамі сталі Мікола Аўрамчык і Аляксей Коршак. Як і іншыя студэнты, якія не толькі захапляліся літаратурай, але і самі пісалі. Разам выпусцілі два нумары рукапіснага часопіса «Першыя крокі». Ды вучоба для яго была нядоўгай. Восенню 1940 года прызвалі ў армію. У войсках хімічнай абароны праслужыў да 1946 года. Быў салдатам, а, атрымаўшы званне лейтэнант, стаў камандзірам узвода.

Некалькі разоў наведваўся ў Маскву. Сустракаўся з Васілём Віткам, Пятром Глебкам, Максімам Танкам, Кузьмой Чорным і іншымі літаратарамі. І працягваў пісаць вершы. Некаторыя з іх, а таксама напісаныя пасля Перамогі склалі змест яго першай кнігі «Зварот шчасця» (1946), праз чатыры гады выйшла — «Б'юць куранты». Тое, што ўвайшло ў іх, калі казаць шчыра, было не горшае за напісанае іншымі паэтамі, якія вярнуліся да мірнага жыцця. Аднак і не лепшае. Гэтага не мог не разумець і сам Мікола Іванавіч. А тут яшчэ знаёмства з тым, чыімі творамі зачытваўся ў маленстве. Сведчыў: «Пад уплывам Янкі Маўра, відаць, тады ў мяне зарадзілася жаданне пайсці следам за ім, пісаць для дзяцей».

З першымі апавяданнямі выступіў у газеце «Зорька». Неўзабаве ўзяўся і за больш «вялікі» жанр. Задумаў напісаць аповесць «Добры дзень, школа!». Завяршыў яе ў 1952 годзе і прапанаваў рукапіс для азнаямлення свайму літаратурнаму куміру. Праз два тыдні Янка Маўр патэлефанаваў і запрасіў да сябе дадому. Іван Міхайлавіч да твора паставіўся надзвычай сур'ёзна, аб чым сведчылі зробленыя заўвагі, але ў цэлым аповесць ухваліў. Дапрацаваная Міколам Гамолкам, праз год яна выйшла асобнай кнігай.

У гэты час ён ужо працаваў над новай аповесцю — «Лета ў Калінаўцы». Таксама з жыцця хлопчыкаў і дзяўчынак пасляваеннага часу. Праўдзівасці і пераканаўчасці дасягнуў таму, што прататыпаў асноўных літаратурных герояў ведаў добра. А ў характарыстыцы галоўнай гераіні, дзіцяці вайны Ніны Воранавай, нямала ўзяў фактаў з жыцця сваёй жонкі. Першы варыянт твора — па-руску, удалы. У 1956 годзе аповесць пабачыла свет у Маскве. Тым не менш першапачатковы варыянт яго не задаволіў. Асобныя месцы дапрацоўваў, рыхтуючы беларускамоўны варыянт. Пасля гэтага з'явіліся яшчэ два выданні «Лета ў Калінаўцы».

Добраму веданню Міколам Гамолкам школьнага жыцця паспрыяла і тое, што ў 1951—1962 гадах ён быў адказным сакратаром часопіса «Бярозка». Дарэчы, Мікола Іванавіч — з пісьменнікаў, перакананых, што пастаянны занятак не шкодзіць творчай працы. Пасля дэмабілізацыі з войска, у 1947 годзе, прыйшоў у Дзяржаўнае выдавецтва БССР. Быў і «лімаўцам», хоць і нядоўга, загадчыкам аддзелам літаратуры і мастацтва газеты «Чырвоная змена», а пасля «Бярозкі» — адказным сакратаром камісіі па Дзяржаўных прэміях БССР пры Савеце Міністраў рэспублікі, літаратурным кансультантам, а потым дырэктарам Бюро прапаганды мастацкай літаратуры Саюза пісьменнікаў Беларусі.

Аднак гэтай праблематыкай яго творчыя памкненні не абмяжоўваліся: «Мяне даўно прываблівала тэма пакарэння чалавекам космасу. Гэтаму садзейнічалі працы Цыялкоўскага, адкрыццё атамнай энергіі. Захацелася зазірнуць у заўтрашні дзень, адказаць сродкамі мастацкай фантастыкі на пытанні, якія хвалявалі мяне, ды і іншых, імкнучыся задаволіць разнастайныя культурныя патрабаванні моладзі».




Калаж Святланы Таргонскай.

А яшчэ адзін з навукоўцаў ускосна падштурхнуў яго ўзяцца і за касмічную тэму. Было гэта падчас працы Міколы Гамолкі ў выдавецтве. Слова за словам гэты наведвальнік заўважыў: а чаму б не выпускаць кнігі пра палёты ў космас? Сапраўды, у гэтым кірунку быў непачаты край работы. Чаму б самому, падумаў Мікола Іванавіч, не паспрабаваць абжываць амаль непачатую беларускай літаратурай дзялянку. Так напісалася аповесць «За вялікую трасу», працягам якой стала «Цытадэль неба». Пад адной вокладкай яны выйшлі як навукова-фантастычны раман «Шосты акіян» (1959). А п'еса «Бітва ў космасе» была пастаўлена тэатрам юнага гледача.

Стаўшы адным з першапраходцаў касмічнай тэмы ў беларускай літаратуры — следам за «Фантамабілем прафесара Цылякоўскага» Янкі Маўра і творамі Уладзіміра Шыціка, ён належаў і да тых, хто адным з першых пачаў плённа асвойваць прыгодніцкі жанр у дзіцячай літаратуры. Пачатак гэтаму паклаў аповесцю «Дзяўчына ішла па вайне». Але большы рэзананс мела «Лясная крэпасць», заснаваная на рэальных фактах, што мелі месца ў гады Вялікай Айчыннай вайны каля возера Чырвонае Жыткавіцкага раёна.

Сюжэт падказаў настаўнік са Старых Дарог, які партызаніў у тых мясцінах. Сталася так, што ў час варожай аблавы ён апынуўся з адным юным партызанам на зыбкім паўвостраве. У час бамбёжкі яны страцілі прытомнасць. Калі ж апрытомнелі, убачылі, што паўвостраў адарвала ад сушы. Сітуацыя ў нечым быкаўская. Яна сведчыць аб тым, што на вайне магчыма і такое, у што паверыць цяжка. У гэта ніяк не хацелі верыць і ў выдавецтве, калі прапанаваў рукапіс гэтай аповесці. Літаратурных персанажаў падлетка Цітка і Вадзіма Мікалаевіча «ўратаваў» Васіль Быкаў. Рэцэнзія Васіля Уладзіміравіча запаліла перад рукапісам зялёнае святло. Ён пісаў: "Лясная крэпасць" — вострасюжэтны твор для дзяцей. Аўтару ўдалося добра пабудаваць інтрыгу, стварыць прываблівыя вобразы нашых людзей і агідных акупантаў. Дзеянне разгортваецца паволі і дасягае кульмінацыі ў самым канцы, што спрыяе павелічэнню займальнасці твора. Самай вялікай удачай яго, аднак, трэба лічыць вобраз хлопчыка Цітка, абаяльная сіла якога роўная яго мужнасці».

Віктар жа Казько зычліва паставіўся да аповесці Міколы Гамолкі «Сокалы-сакаляты». Таксама з элементамі прыгодніцтва, драматычным сюжэтам, але разам з тым праўдзівым, дзе характары выпісаны псіхалагічна глыбока. «Дапамагалі» Міколу Іванавічу і чытачы, якім спадабалася яго аповесць «Дзяўчына ішла па вайне». Ім хацелася даведацца пра далейшы лёс юнай партызанкі Ніны Воранавай. Пасля гэтага, праз 17 гадоў пасля папярэдняй, з'явілася аповесць «Партызанскія сёстры». Але так і застаўся ненадрукаваным раман «Люблю і ненавіджу». Як і першая частка рамана «Голуб у акне», завяршыць які Міколу Гамолку перашкодзіла смерць, што напаткала яго 3 мая 1992 года.

Мне пашчасціла не проста пазнаёміцца з Міколам Іванавічам. У адносінах склаліся прыязныя стасункі. Адбылося гэта дзякуючы яго сябру, а майму, не пабаюся гэта сказаць, старэйшаму сябру Аляксандру Капусціну, які пэўны час працаваў намеснікам галоўнага рэдактара «ЛіМа». А яшчэ больш зблізіў мяне з Міколам Гамолкам даволі цікавы выпадак.

Аляксандр Пятровіч, ужо вядомы «дарослы» пісьменнік, у 1975 годзе прапанаваў у «Бібліятэку часопіса "Вожык"» рукапіс сваёй першай гумарыстычна-сатырычнай кніжкі. У той час падобныя зборнікі выходзілі з абавязковай прадмоўкай. Я згадзіўся яе напісаць, аднак у рэдакцыі запярэчылі. Бо хто я быў на той час? Кніжкі ніводнай, у Саюз пісьменнікаў БССР не ўступіў. Не паклапаціўся і аб членстве ў Саюзе журналістаў. Тады Аляксандр Капусцін папрасіў Міколу Іванавіча. Але той запярэчыў, што ў яго не атрымаецца. Трэба ж коратка, ды каб хоць крыху гумару.

Выйсце знайшлі ў тым, што пішу я, а прозвішча ставяць Міколы Гамолкі. Заплацілі годна. Добра памятаю, што амаль 25 рублёў. Амаль чвэртка «лімаўскага» акладу. Лёгка знайшлі і яшчэ адно выйсце. Няблага пасядзелі ўтрох у рэстаране «Лета», які некалі знаходзіўся ў Мінску на вуліцы Ульянаўскай, непадалёку ад моста праз Свіслач, насупраць парку.

Пачаў я пра літаратуру, а закончыў… Аднак літаратура ж, калі казаць коратка, — адлюстраванне жыцця. А ў ім жа самае рознае бывае. І няблага б пра літаратараў часцей пісаць не толькі як пра пісьменнікаў, але і як жывых людзей.

**Алесь МАРЦІНОВІЧ**

# Галерэя «Мастацтва»: новыя ініцыятывы

**Жыццё ў мастацкіх салонах, здавалася б, не вельмі кіпіць. Аднак такое меркаванне памылковае. Варта сачыць за календаром выставак і розных мерапрыемстваў — і вы зразумееце, што і пайсці ёсць куды, і цікавостак паўсюль хапае. А зараз мы прапануем чытачу гутарку з новым кіраўніком галерэі Беларускага саюза мастакоў «Мастацтва» Паўлам Сапоцькам.**



*Павел Сапоцька.*

**— Павел Міхайлавіч, вы вярнуліся да працы ў галерэйнай справе, атрымаўшы прызначэнне дырэктара галерэі «Мастацтва». З чаго пачынаеце?**

— Рады свайму вяртанню ў культуру. Па сутнасці, мая адміністрацыйная праца пачыналася менавіта з галерэйнай справы: з 2015 да 2018 года працаваў дырэктарам мастацкай галерэі «Універсітэт культуры» Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў у Палацы Рэспублікі. Ды і на пасадзе дырэктара Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь праводзіў мноства тэматычных мастацкіх выставак.

Зараз у галерэі праходзіць персанальная экспазіцыя члена Беларускага саюза мастакоў Галіны Горавай, у перспектыве адбудуцца вернісажы Сяргея Пыжыкава, Канстанціна Андруковіча, Алеся Квяткоўскага і іншых таленавітых творцаў.

Зробім выразны акцэнт на падзейных мерапрыемствах: прэзентацыях выданняў, творчых сустрэчах, лекторыях. У красавіку адбудзецца прэзентацыя кнігі вядомага калекцыянера экслібрысаў, твораў графічнага мастацтва Алега Судлянкова «Гісторыя беларускіх кніжных знакаў XVI — XX стст.» з выстаўкай графікі беларускіх мастакоў. Нам вельмі хацелася б, каб у галерэю прыходзілі новыя людзі, і кніжнікі таксама.



*Работа Ігара Бархаткова «Вясенні нацюрморт».*

**— Усё ж галерэйны рух сёння ў большай ступені сарыентаваны, відаць, на продаж? Ці гэта не так? А як, дарэчы, зараз будзе ў гэтым плане ў «Мастацтве»?**

— Перад галерэяй стаяць некалькі задач: гэта і папулярызацыя беларускага мастацтва праз выстаўкі і іншыя мерапрыемствы, і рэалізацыя твораў нашых беларускіх мастакоў. У нас добрая выставачная зала ў самым цэнтры горада і адначасова салон-крама з шырокім асартыментам мастацкіх твораў аўтарства больш за 100 майстроў. Час для галерэйнага бізнесу зараз вельмі складаны. У асноўным творы раней купляліся замежнікамі: турыстамі, членамі дэлегацый. Наша мастацтва вельмі шануецца ў свеце, беларускіх майстроў ведаюць і паважаюць. Шматлікія калекцыянеры з розных краін свету мараць мець у сваіх прыватных зборах работы нашых суайчыннікаў — графікаў, жывапісцаў… Зараз, відавочна, трэба займацца актыўным прасоўваннем галерэі: сайт, сацыяльныя сеткі, падзейныя праграмы, публікацыі ў СМІ і іншыя крокі. Пачынаем працаваць з кафедрай маркетынгу Інстытута бізнесу БДУ па стварэнні новай візуальнай канцэпцыі. Адным словам, час патрабуе новых падыходаў і крэатыўных рашэнняў.

**— Ці можна разлічваць прыватным калекцыянерам на супрацоўніцтва з вашай галерэяй? Якія ініцыятывы ў гэтым напрамку збіраецеся рэалізаваць?**

— Вядома ж, будзем супрацоўнічаць! І вельмі актыўна! З калекцыянерамі мы можам праводзіць выстаўкі, працаваць з імі як з экспертамі і куратарамі. У зборах калекцыянераў шмат цудоўных твораў, якія ўяўляюць вялікую каштоўнасць і цікавасць для шырокай публікі. А дэманстраваць іх трэба ў выхаваўчых і асветніцкіх мэтах. Уяўляецца актуальным таксама правядзенне лекцый з запрашэннем калекцыянераў, асабліва тых, хто збірае менавіта беларускія карціны, скульптуры нашых майстроў, экслібрысы, кнігі і іншае. Яны — носьбіты ўнікальных ведаў і транслятары багатага гістарычнага матэрыялу.

**— Скажыце, а якое вам асабіста мастацтва болей даспадобы?**

— Мне вельмі падабаюцца работы беларускіх пейзажыстаў: Івана Хруцкага, Віталя Цвіркі, Паўла Масленікава, Мікалая Дучыца, Ізраіля Басава ды іншых. Ганаруся асабістым знаёмствам з Валерыем Шкарубам, Уладзімірам Рынкевічам, Рыгорам Шаўрам, Уладзімірам Пракапцовым, Мікалаем Аўчыннікавым, Аляксандрам Грышкевічам, Эдуардам Мацюшонкам… Заўсёды захапляюся сучаснай беларускай графікай, асабліва такімі аўтарамі, як Генадзь Вяль, Уладзіслаў Квартальны, Павел Татарнікаў, Вольга Крупянкова, Фёдар Шурмялёў, Таццяна Сіплевіч, Леў Алімаў, Усевалад Швайба і шмат кім яшчэ.

**— Павел Міхайлавіч, ваша родная маладзечанская старонка багата на таленты жывапісцаў, графікаў. Ці не думалі калі-небудзь, кіруючыся ідэямі мастацкага краязнаўства, стварыць, напрыклад, кнігу на гэтую тэму?**

— Дзякую за такую падказку, за такую ідэю, я быў бы шчаслівы стаць складальнікам падобнай кнігі! І ўвекавечыць у ёй імёны і палотны цудоўных майстроў. Даўно ў гісторыі беларускага мастацтва прысутнічаюць Канстанцін Харашэвіч, Юрый Герасіменка-Жызнеўскі, Ядвіга Радзялоўская. Выдатныя работы такіх мастакоў, як Аляксандр Пашкевіч, Галіна Сушко, Васіль Лазоўскі, Мікалай Аўчыннікаў, Васіль Таркан, Ядвіга Сянько, Людміла Летунова… Такая кніга — сапраўды цудоўны прыклад мастацкага краязнаўства!

**— Як вядома, сталымі чытачамі «Літаратуры і мастацтва», газеты творчай інтэлігенцыі краіны, з'яўляюцца ў першую чаргу пісьменнікі. Скажыце, ці можна разлічваць на тое, што ў галерэі «Мастацтва» вартае месца зойме кніжная графіка, ілюстрацыі да кніг — і на выстаўках, і ў продажы?**

— Безумоўна! Мы будзем рады, калі галерэя стане месцам для прэзентацыі кніг пра беларускае мастацтва і культуру ў цэлым. Можна ладзіць творчыя сустрэчы з пісьменнікамі, аўтограф-сесіі. Я ўспамінаю, як некалі мы стваралі экспазіцыі з прэзентацыямі кніжных выданняў у межах Мінскай міжнароднай кніжнай выстаўкі-кірмашу і ў галерэі «Універсітэт культуры», і ў Нацыянальным гістарычным музеі. І заўсёды было цікава!



*Керамічныя вырабы Міхаіла Бруя.*

У нейкім сэнсе кніга — вынік суаўтарства пісьменніка і мастака. Цудоўныя прыклады — раман «Дзікае паляванне караля Стаха» Уладзіміра Караткевіча, афармлены Юрыем Якавенкам, паэма «Новая зямля» Якуба Коласа з графікай Георгія Паплаўскага, кніга Уладзіміра Арлова і Паўла Татарнікава «Айчына. Маляўнічая гісторыя».

Дарэчы, я назаўжды запомню першае яркае ўражанне ад кнігі рускіх казак «Серебряное блюдечко и наливное яблочко», якую праілюстравала Вольга Кандакова. Столькі эмацыянальных уражанняў пакідае яна ў свядомасці пры кожным перагортванні старонак. Сапраўдную асалоду ад гэтага атрымліваеш, сапраўднае эстэтычнае задавальненне!

А літаральна днямі набыў кнігу апавяданняў Алены Міхаленкі «Як яны сталі святымі?» з ілюстрацыямі Анастасіі Балыш (выдавецтва «Беларуская энцыклапедыя імя Петруся Броўкі»).

**— І некалькі бліц-пытанняў: ваш любімы пісьменнік?**

— Сяргей Грахоўскі…

**— Мастацкае афармленне якой кнігі беларускіх пісьменнікаў вы лічыце найболей удалым?**

— Кніга «Беларускія народныя казкі» з ілюстрацыямі навучэнцаў Мінскай дзяржаўнай гімназіі-каледжа мастацтваў (выдавецтва «Пачатковая школа», 2017)…

**— Ваш любімы празаічны твор у беларускай літаратуры?**

— «Трывожнае шчасце» Івана Шамякіна…

**— Любімы верш у беларускай паэзіі?**

— «Люцыян Таполя» Максіма Танка…

**— Калі вы будзеце заказваць сабе экслібрыс, то на якую тэму будзе ваш кніжны знак?**

— Вельмі цікавае пытанне, на якое адразу складана адказаць. Але ў ім, экслібрысе, абавязкова будзе элемент, звязаны з маім родным горадам Маладзечна…

**— Каму з пісьменнікаў Беларусі паставілі б помнік у Мінску, акрамя, зразумела, існуючых — Янку Купалу, Якубу Коласу, Максіму Багдановічу, Уладзіміру Караткевічу?**

— Я б усталяваў мемарыяльныя дошкі на дамах, дзе жылі і працавалі беларускія пісьменнікі, якія яшчэ не ўшанаваны ў бронзе.

**— Дзякуй, паважаны Павел Міхайлавіч, за гутарку! Спадзяёмся на пашырэнне самых розных ініцыятыў у галерэі «Мастацтва»! Поспехаў вам!**



*Скульптура Сяргея Гуміляўскага «Мелодыя».*

**Гутарыў Кастусь ЛЕШНІЦА**
**Фота Кастуся ДРОБАВА**

# Дом, які пабудавала Бернарда Альба

**Тэма жанчыны ва ўсіх яе іпастасях — маці, каханая, сястра, дачка — на працягу мінулых стагоддзяў гучала ў неабходнай ступені далёка не заўсёды. Здаецца, часцей тыя ці іншыя катаклізмы спрыялі таму, каб адбывалася пераасэнсаванне ролі жанчыны не толькі ў грамадстве, але і ў сям'і. Сёння, калі чалавецтва прайшло праз мноства этапаў, у тым ліку што тычыцца дадзенага прадмета ўвагі, — новы ўзровень дыскусій, і закранае ён у значнай ступені асновы і традыцыі розных народаў, якія лічацца жорсткімі і разбуральнымі, бязлітаснымі і бессэнсоўнымі. Натуральна, усё гэта адлюстроўваецца ў сучасным мастацтве і літаратуры, аднак многія працягваюць шукаць неабходныя адказы ў творах мінулага.**

Нядзельным вечарам у Новым драматычным тэатры прадставілі прэм'еру — своеасаблівую «драму з жыцця жанчын» «Дом Бернарды Альбы» рэжысёра Лізаветы Машковіч (мастаком-пастаноўшчыкам выступіла Лідзія Малашэнка, рэжысёрам па пластыцы — Марына Баранава, мастаком па святле — Уладзіслаў Рыхтэр). Стваральнікі спектакля звярнуліся да знакамітай п'есы іспанскага паэта і драматурга Федэрыка Гарсіа Лоркі, напісанай у чэрвені 1936 года, за два месяцы да смерці, і вырашылі не мяняць нават арыгінальную назву, падкрэсліваючы гэтым нязменнасць аўтарскай канцэпцыі. У пачатку спектакля «голас за кадрам» зачытвае паведамленне Федэрыка Гарсіа Лоркі: у аснову гэтай п'есы пакладзены сапраўдныя падзеі, якія ён імкнуўся перадаць з дакументальнай фатаграфічнай дакладнасцю. Прататыпам галоўнай гераіні лічыцца багатая землеўладальніца Фраскіта Альба Сьеры, дом якой знаходзіўся насупраць маёнтка бацькі пісьменніка. Сам Лорка не паспеў пракаментаваць тыя ці іншыя здагадкі і асацыяцыі.

Дзеянне ў творы адбываецца, як мяркуюць даследчыкі, у пачатку мінулага стагоддзя ў адным іспанскім паселішчы. Перад гледачом Новага тэатра — дом, паказаны праз мінімум дэкарацый (шмат прасторы, змрок, ненатуральнае святло, выразныя і дакладныя лініі усяго «памяшкання», крэслы, на якіх невыпадкова зроблены акцэнт). Яны не адцягваюць увагу і, трэба сказаць, толькі падкрэсліваюць душэўны стан гераінь. А на сцэне будуць толькі жанчыны, за невялічкім выключэннем, аб якім гаворка пойдзе крыху пазней.

Галоўны персанаж — гаспадыня Бернарда Альба (Наталля Капітонава). Яна двойчы была ў шлюбе, мае пяць дачок і ў пачатку твора становіцца ўдавой. У доме знаходзіцца таксама маці Бернарды, вар'ятка Марыя Хасэфа (Людміла Баталава), і служанка Понсія (Ірына Карніевіч). Кардынальна ўплывае на сюжэт з'яўленне мужчыны — Пепе Рымляніна (Валянцін Уласень). У сям'і становіцца вядома аб яго будучым шлюбе са старэйшай з дачок Ангустыяс (Аксана Баранок), якая лічыцца самай непрывабнай, аднак толькі ў яе варты пасаг (успомнім — і не раз — найпапулярнейшую «Беспасажніцу» Аляксандра Астроўскага). Малодшая дачка Адэла (Ксенія Харашкевіч) таксама аддала сваё сэрца Пепе, і пазней становіцца вядома, што не яна адна: сваё каханне да гэтага мужчыны тоіць і дачка Марцірыя (Ксенія Асташонак). Крыху меней увагі аддаецца іншым сёстрам — Магдалене (Мілана Іванова), якая абстрагуецца ад усіх праз рэлігію, і Амеліі (Ганна Цырэльчук) — яна саркастычна пакепłівае з сёстраў, з сітуацыі ў доме.



У аснове пастаноўкі ляжыць не столькі канфлікт (а ён невырашальны), колькі чалавечыя якасці, якія да яго прывялі. Ганарыстасць і шматвяковыя сямейныя прымхі старэйшага пакалення супрацьпастаўляюцца палкасці і зайздрасці малодшага. Усё гэта прыводзіць да адкрытай варожасці і неразумення, прымушаючы забыць нават пра родную кроў, і заканчваецца трагедыяй. Тэмы, вядома, вечныя і не маюць прывязкі да эпохі ці краіны. «Дом Бернарды Альбы» не ў апошнюю чаргу — гісторыя пра каханне і барацьбу за правa каханць; яна паказвае, што адбываецца з жанчынамі, якім забаронены пачуцці, і на што яны аказваюцца здольныя,



каб абараніць сваю свабоду. Аднак спектакль расказвае пра розныя віды кахання: ад сляпога матчынага да ўсёпаглынальнага гарачага, якое туманіць розум і прыводзіць да страшных вынікаў. Каханне як рабства і каханне як свабода… Але гэта толькі агульныя словы. У цэнтры сюжэта, які, як ужо падкрэслівалася, узяты з жыцця, — дзяўчыны, чые адзінокія сэрцы імкнуцца да пяшчоты. Але дзверы ў свет ім зачынілі: пахаваўшы мужа, Бернарда аб'явіла васьмігадовую жалобу ў адпаведнасці са сваёй сямейнай традыцыяй, і цяпер у яе дом няма доступу «ні мужчынам, ні ветру». Маці гатова на ўсё, каб абараніць гонар дачок. Толькі з яе дазволу мог здзейсніцца шлюб Пепе Рымляніна і Ангустыяс. Астатніх мужчын паселішча яна не палічыла вартымі ўвагі.

Важная частка твора — самасуд над незамужняй жанчынай, якая нарадзіла і забіла сваё дзіця. Усё сямейства выступае за такое пакаранне. Акрамя Адэлы, якая, што зразумела з некаторых рэплік і сцэн, тайна сустракаецца з Пепе. Тут час успомніць пра, здаецца, невынішчальныя рэчы — рознага тыпу забабоны, рэлігійны фанатызм, сямейную тыранію, якія калі і не з'яўляюцца канкрэтнай прычынай тых ці іншых страшных дзеянняў з боку жанчыны, то дакладна падштурхоўваюць да іх. Колькі непатрэбных забарон, колькі навязаных стэрэатыпаў атачаюць жанчын у жыцці, якое часта становіцца для іх турмой у той час, як для мужчын яно — свабода. Такой жа ахвярай можна назваць і Бернарду, заложніцу грамадскіх асноў, нявольніцу прымхаў, якая жыве ў пастаянным страху, што хто-небудзь даведаецца аб сапраўдным становішчы спраў. Не з такіх, як яна, усё пачалося і не імі скончыцца.

Нібы прывід спектакля — Марыя Хасэфа. Зняволенне гэтага персанажа яшчэ больш жорсткае, паколькі яе турма — уласны пакой, а турэмшчык — дачка Бернарда. Старая хварэе і знаходзіцца на мяжы вар'яцтва, але патрэбна для таго, каб паказаць люстраны адбітак заглушаных бакоў дачкі, сутнасць жаночай прыроды, яе натуральных законаў. Эратычнае трызненне гэтага персанажа выглядае крамольным у вышэйназваных абставінах, аднак падсвядомасць — тое, што немагчыма кантраляваць.

Не вельмі зразумела, чаму «Дом Бернарды Альбы» ад самага стварэння лічыцца выключна драмай. У кожнай з гераінь свая трагедыя, але павернутая да гледача агульным для ўсіх бокам. Іх лёсы кантрастуюць адзін з адным, супадаючы толькі ў краху, і ўсе яны роўна неабходны для агульнай карціны трагедыі. У спектаклі пануюць чорны і зялёны колеры. Першы нібы хавае ў сабе ўсё, што зроблена нешчаслівым чалавекам. Зялёны — колер сукенкі, якую апранае Адэла ўжо ў першы дзень жалобы. Гэты колер у творы сімвалізуе стыхію, касмічную волю, зліццё з прыродай. Ён паказвае натуральную хаду жыцця, якой супрацьстаіць смерць у асобе ледзь не кожнага героя: Бернарды, Пепе, Ангустыяс… Між тым Лорка ў сваёй творчасці заўсёды выяўляў экзістэнцыяльнае адзінства кахання і смерці, аднак такая тэма для асобнай гутаркі.

Між тым смерцю ў множстве яе праяў і завяршаецца пастаноўка. Тут трэба засяродзіцца на выразным адрозненні ад арыгінальнага фіналу. У Лоркі Бернарда страляе ў Пепе, які ўцякае, але прамахваецца. Марцірыя хлусіць Адэлі пра яго забойства, тая губляе галаву ад гора і вешаецца. Бернарда загадвае ім пераапрануць сястру ў белае і маўчаць аб тым, што здарылася, і па якой прычыне яе не стала. Баязлівая тыранка хоча, каб ніхто і ніколі не даведаўся аб тым, што яе дачка памерла не нявінная. У гэтым самагубстве шмат шэкспіраўскага (увогуле, нягледзячы на арыгінальнасць і непаўторнасць уласнага тэатра, Лорка звяртаецца да традыцый мастацтва сцэны), аднак у пастаноўцы Новага тэатра ад гэтага шэкспіраўскага пазбавіліся, як, дарэчы, і ў адметнай аднайменнай стужцы 1982 года рэжысёра Бедзіны Чхеідзэ. У спектаклі адсутнічае сцэна са стрэлам: «закаханы» Пепе не плануе забіраць дзяўчыну з сабой, ён пакідае яе ў гэтым доме.



Тут дарэчы звярнуцца да прысутнасці мужчын у творы. Галава сям'і згадваецца толькі некалькі разоў: як распуснік і чалавек, які пакінуў старэйшай з сясцёр, не роднай дачцэ, большую частку маёмасці. У п'есе адзначаецца, што толькі Магдалена яго любіла. Асоба Пепе Рымляніна яшчэ больш абстрактная. Ён з'яўляецца на сцэне толькі некалькі разоў (а гэта таксама адметнасць — звычайна гледачы толькі адчуваюць яго прысутнасць), не вымаўляе ніводнай рэплікі, увасабляючы не столькі мужчыну (аднак тут, як заўсёды, ёсць над чым паразважаць), колькі прыродную стыхію, імкненне да свабоды і апошнюю надзею на ўцёкі…

Між тым у даволі традыцыйным спектаклі «Дом Бернарды Альбы» шмат спеваў і харэаграфічных нумароў. Часам гераіні спрабуюць данесці да гледачоў усё недагаворанае жэстамі, паўзамі, узмахамі суkenак (хоць узмахаў гэтых, дарэчы, магло быць і менш)… Падчас дзеі гучаць не толькі звыклыя іспанскія матывы, але і іх адметныя «пераўвасабленні», напрыклад, кампазіцыя пад *The Doors* «*Spanish Caravan*». І калі яна яшчэ больш-менш упісваецца ў пастаноўку, то музыка, якую падабралі для паклону, абсалютна не падыходзіць пад агульны настрой. Яна нібы завяршае яркі канцэрт, а не драматычны спектакль з трагічным фіналам. Падзеі «Дома Бернарды Альбы» завязаны на гранічна эмацыянальных праявах чалавечай сутнасці: нянавісці, злосці, вар'яцтве, роспачы і разам з тым — жаданні любіць і дарыць сваю пяшчоту іншым. І ўсё гэта псуецца абсалютна недарэчным фонам.

**Яўгенія ШЫЦЬКА**

**Фота Новага драматычнага тэатра**

# Залаты хан і новыя землі

**На пачатку XVII стагоддзя Расія ўсё больш прыцягвала ўвагу еўрапейскіх краін. Асабліва яе ўсходнія рэгіёны, на дзіва багатыя пушнінай ці, як казалі замежныя купцы, «мяккай рухлядззю». Яе абменьвалі на тавары, якіх у маскоўцаў не было, часам аплачвалі золатам. Агромністыя прасторы, населеныя мясцовымі плямёнамі, інтэнсіўна абжываліся. Узнікалі астрогі, зімнікі. Колішнія паселішчы пашыраліся. Табольск, напрыклад, ператварыўся ў найбуйнейшы цэнтр Сібіры. З'явіўся і самы ўсходні на той час рускі горад Томск.**

Першага з дынастыі Раманавых цара Міхаіла Фёдаравіча і яго акружэнне цікавілі Манголія і Кітай. Пасольскі прыказ, які займаўся замежнымі сувязямі, у 1615 годзе для разведвання шляхоў накіраваў туды спецыяльнае пасольства. У яго ўвайшлі татарскі атаман Васіль Цюменец і цюменскі дзясятнік Іван Цякуцьеў. Ён паходзіў «из литвинов». У сённяшнім разуменні быў беларусам. Калі і дзе нарадзіўся, невядома. Як і дакладны год смерці. Магчыма, сам перайшоў на службу ў Масковію. А мо яшчэ яго бацька, а то і дзед.

Аднак першыя захады па адкрыцці згаданых зямель былі распачаты сем гадоў назад, пры Васіліі Шуйскім. У пасольстве Івашкі Белагаловага таксама быў наш зямляк — перакладчык, як тады казалі, тлумач «Гришка Михайлов Литвин». Кіргізскія князькі Немча і Качубей абяцалі гэтым пакаральнікам паказаць шлях у Манголію і далей — у Кітай. Але слова не стрымалі.

Некалі магутная мангольская феадальная дзяржава на той час распалася. Княствы між сабой варагавалі. Некаторыя межавалі з расійскімі землямі. У першую чаргу — Хатагойцка-Уранхайскае. У дыпламатычных дакументах усіх правіцеляў іх называлі «алтын-ханамі», у перакладзе з мангольскай — «залатымі ханамі». На час пасольства Цюменца гэтае княства належала Ірдэнею Кунгачаю, уладальніку вялікай тэрыторыі ад Заходніх Саянаў да схілаў мангольскага Алтая. Разлічвалі на яго падтрымку. Але з-за міжусобных войнаў яму было не да гэтага, а самастойна прадаўжаць шлях не рызыкнулі. Ды сякія-такія звесткі атрымалі. У рапарце паведамлялі, што «ў китайского государя город каменный, а дворы же в городе с русково обычья». Даведаліся і пра апратку «китайского государя»: «платье же оне носят все золотое, а привозят де к нему всякие узоросья (упрыгожанні. — **А. В.**) из многих земель». А «бой де у нево огняной», г. зн. карысталіся агнястрэльнай зброяй.

У новае пасольства ўвайшоў і Грышка Літвін. Тобольскі ваявода Іван Куракін загадаў «проведывать Китайское государство» водным шляхам. Не ведаў, што да Алтын-хана і ў Кітай так не дабрацца. Калі яму патлумачылі гэта, загад удакладніў: «...в Томском уезде имати провожатых и толмачей, сколько будет пригож, которые Алтына царя и его людей языку знают». Распарадзіўся і загадзя пасылаць ганцоў для выведкі найлепшых праходаў праз горы. А таксама захопу заложнікаў, знаходжанне якіх у Томску дазволіць падарожнікам адчуваць сябе ў бяспецы.

Ганцамі сталі Іван Цякуцьеў і Васіль Ананьін. Яны накіраваліся да «каменного городка» на рацэ Белы Іюс, дзе знаходзілася стаўка кіргізскіх князёў: «А шли до киргиз от Томского города три недели, а были там в дороге поля и горы каменные, а реки все были и до киргизской земли бредовые, с лошадей вьюков не сымывали». Калі пераадолелі хрыбет Алатау, Іван Цякуцьеў паслаў да Алтын-хана кіргізскага князя Кору. Сам застаўся з талмачом Лукой.

Васіль Ананьін, узяўшы заложнікаў, накіраваўся назад у Томск, каб вярнуцца з Васілём Цюменцам і «охочими людьми, конными казаками, целовальниками и жилецкими людьми». «Целовальники» — тыя, хто даў прысягу і знаходзіўся на дзяржаўнай службе. А «жилецкие люди» — дваране, якія часова з'яўляліся служылымі.

З Томска адправіліся на конях. Хоць і спяшаліся, знаходзіліся ў сядле ці не з ранку да вечара, дарога ўсё адно заняла тры тыдні. Асаблівыя цяжкасці напаткалі ў горнай мясцовасці. Рызыкуючы жыццём, прабіраліся вузкімі сцежкамі. Радавала, аднак, тое, што мясцовае насельніцтва ставілася прыхільна. Дзялілася прадуктамі. Узамен стомленых коней аддавалі сваіх. Ахвотна ўказвалі карацейшы шлях.

Праз кіргізскія землі трапілі ў «Табынскую землю». Тамашнія качэўнікі жылі ў заслонах — шалашах з жэрдак, пакрытых галінкамі, а ў больш багатых — скурамі. Табынцы — гэта племя тубінцаў. Яно мела змешанае паходжанне. У чымсьці цюркскае. Было міралюбівае, памяркоўнае, чым і карысталіся суседзі. Тубінцы плацілі ясак і кіргізскаму князю, і Алтын-хану.

Іван Цякуцьеў, далучыўшыся да Васіля Цюменца, паведаміў яму, што князь Кору вярнуўся ад Алтын-хана не адзін, а з яго пасланцом Табынцам. Як высветлілася, Алтын-хан з нецярпеннем чакае прыезду паслоў. Папяшаліся ў яго ўладанні. Напярэдзе падарожнікаў чакалі горныя перавалы, месцамі пакрытыя снегам. Днём ён крыху раставаў, а пад вечар камяністыя сцежкі пакрываліся скарынкай лёду. Коні слізгалі капытамі, падалі.

Асабліва непрыветнымі аказаліся Заходнія Саяны: «А тою дорогою оне в ту семь ден трох горы каменные, а лежат на них снеги зимою и летом безпрестанне, и оболока на тех горах лежат, и стужа на них живет во все лето». Саянскай зямлёй валодаў князь Кара-Сакула, стаўка якога знаходзілася на адным з левых прытокаў ракі Кемчык. Праз тыдзень трапілі да яго. Сустрэў іх з усімі ўшанаваннямі. Да ўладанняў Алтын-хана заставалася дзён дзесяць шляху.

Мінуўшы вярхоўе ракі Кемчаг (сённяшняя назва Кемчык, ці Хемчык), пераправіліся праз раку Чорныя Брады, якая, як пазней засведчылі, «бежит щелью каменной». Пасля ўдалай пераправы пераадолелі яшчэ некалькі горных перавалаў. За выключэннем аднаго, што быў вельмі высокі, гэта не выклікала вялікай цяжкасці. І трапілі ў даліну ракі, назву якой запамяталі ці палічылі не вартым называць. Мабыць, гэта была рака Харын-гол. Падышлі да вадаёма: «...а как озеро велико, меж гор каменных, вода в нем солона, а как то озеро словет, того не упомнят». Відаць, убачылі возера Урук-нур, абышоўшы якое праз два дні дасягнулі «Матцкой земли», дзе правіў князь Кундурчэй, а служыў ён «со всею землею Алтыну царю», якому плаціў ясак. Назва «Матцкая зямля» паходзіць ад цюркскамоўнага племені маадаў, інакш мадаў. Яны адны з продкаў сучасных тувінцаў.



Па дарозе сустракалі развалiны старажытных будынкаў. Гэта былі рэшткі збудаванняў уйгураў, узведзеныя ў XIII стагоддзі ў абарончых мэтах. Тады ў іх была магутная дзяржава, што аб'яднала вакол сябе суседнія народы. Апошнія два дні паслы ішлі стэпамі ў катлавіне возера Убса-мур.

Алтын-хан паслаў насустрач ім «двух царевичей с пятьюдесятью лучшими ратниками». Атрымалася нешта накшталт ганаровай варты. Для жытла адвялі спецыяльную «избу полотеную, от царева стану с полверсты». Накармілі найлепшымі прысмакамі: «а есть было баранье мясо, молоко коровье, вино из кумыса, — бело, а пьяно: только братина духовую выпить, и человек пьян будет так, что с меду». «Братина духовая» — сасуд, з якога пілі ці разлівалі хмяльны напой.

Праз некаторы час пачаліся перамовы аб пераходзе княства ў расійскае падданства. Алтын-хан даўно хацеў мець моцнага суседа, толькі прысягаць на вернасць не спяшаўся. Паслы і не настойвалі. Далейшыя ўзаемаадносіны абмяркоўваліся тры дні, не спяшаючыся і дэталёва. Нарэшце Алтын-хан згадзіўся стаць расійскім падданым. Пасля прынняцця прысягі абмяняліся падарункамі. Алтын-хан і яго сыны атрымалі аднарадкі-кафтаны, аднарадкі звычайныя, 13 талераў з волава, 4 катлы, 6 нажоў. Паслам жа падарылі аднарадкі-халаты, талеркі, катлы з медзі і таксама нажы, толькі каваныя. Як відаць, усё гэта былі — і з аднаго боку, і з другога — прадметы, патрэбныя ў паўсядзённым жыцці.

Урачыстасці прадоўжыліся ў час афіцыйнага прыёму, правільней — некалькіх прыёмаў. Першы праходзіў у будыйскім храме. Пасля доўгіх прывітанняў і роспытаў аб жыцці-быцці ханскі сын, які меў тытул хутухты ці кутухты і ўзначальваў будыйскую царкву ў княстве, правёў малебен.

Як праходзіў ён, відаць з гэтага запісу: «...а сидел кутукта — особно устроено ему место рундуком (спецыяльна пафарбаваная скрыня. — **А. В.**) выше царева места, и обито кругом алтобасом (персідская парча. — **А. В.**) золотным, а над ним здело что киотом (шкап альбо прыстаўка для ікон. — **А. В.**), а на верху в его места написаны по их вере образы на бумаге и прибиты на камках (шаўковая, прашытая золатам тканіна. — **А. В.**), к избе, и нисмо велико, неведомо какое».

Пасля малебну Алтын-хан арганізаваў банкет. Сам сядзеў за нізкім сталом. Блізкае акружэнне размясцілася за гэтакімі ж сталамі. Кожны заняў сваё месца паводле сацыяльнага становішча і прыдворнага статусу. Усе апрануліся як мага лепш. Хан быў у белым халаце з кітайскага шоўку. На галаве — невялікая шапка з лісінага футра. Ён выглядаў намнога старэй сваіх 49 гадоў. Ва ўсякім разе так падалося гасцям: «А сам царь лет с шестьдесят». Тым не менш зрабіў прыемнае ўражанне: «броду бреет: только ус; волосом черн, ростом дороден и плечист, а собою во всем пригож».

Перад зваротнай дарогай гасцявалі яшчэ чатыры дні. У адзін з іх Алтын-хан наладзіў спаборніцтва ў стральбе з пішчаляў. Мабыць, спадзяваўся, што роўных яму не знойдзецца. Аднак казак Цімафей Іваноў, тройчы страляючы, нязменна трапляў у цэль.

Дамоў паслы вярталіся з коньмі, баранамі, дарагімі халатамі і нават футрамі з собаля і, што цікава, з бабрынага меху. Відаць, тады бабры вадзіліся і ў паўночна-заходняй Манголіі. І не адны вярталіся, а з пасламі Алтын-хана — Даянам і Кічэнгалі. Ён падрыхтаваў рускаму цару падарункі і вызначыў людзей, якія б прадстаўлялі ў Маскве яго інтарэсы. Так быў пакладзены пачатак афіцыйным руска-мангольскім сувязям. Прыемна, што дзякуючы і аднаму выхадцу «из литвинов».

Васіль Цюменец і Іван Цякуцьеў сабралі шмат каштоўных звестак і аб суседзях гэтага княства: «А будучи они (тыя, хто запісваў аповеды паслоў, нярэдка ўсё называлі не ад першай асобы. — **А. В.**) в земле у Алтын-царя, проведывали про Китайское и про иные государства, каково которое государство, и каковы в нем люди, и какова вера, и с какими государства межь себя в ссылке, и каков у которых людей ратной бой».

Засведчылі, што Кітайская дзяржава размешчана «на край губы морской, а город да кирпичный, велик, ехать около его на коне десят ден, а ходу до Китайского государства от Алтын царя месец». Назвалі і правіцеля — Тайбын. Як відаць, Кітай падтрымліваў сувязі з многімі дзяржавамі, туды прыходзілі вялікія марскія судны пад парусамі. А на кожным «до двести-триста человек». Акрамя сталіцы, былі і іншыя гарады «великие, кирпичные». Паведамілі паслы і аб тым, як апранаюцца кітайцы: «а платье носят, люди китайские, всякое и бархотное и атласное и камчатное».

У Томск вярнуліся 22 лістапада. Пакінулі хворых — і адразу ў Маскву, дзе іх, а таксама пасланцоў Алтын-хана і кіргізскага хана чакаў урачысты прыём.

У ліпені 1617 года Івана Цякуцьева павысілі па службе. Ён стаў баярскім сынам. Пасля «служил зимние и летние тридцать лет, и в посылки посылан был во многие, и на многих боех ране бывал, и языки измывал».

Мангольскія ж паслы пакінулі Маскву ў 1618 годзе. У лютым вярнуліся ў Томск, дзе жылі да мая. А ў гэты час у Маскве рыхтавалася місія ў Кітай на чале з Іванам Петліным, які ведаў многія мовы і неадночы бываў у далёкіх землях. Напярэдзе — доўгі шлях праз Саяны да Алтын-хана і далей у Кітай. Для іх шмат значылі звесткі, атрыманыя першапраходцамі Васілём Цюменцам і Іванам Цякуцьевым.

**Алесь ВІШНЕЎСКІ**

# «Якім нарадзіўся, такім мяне ешце…»

**Прынцыпу Максіма Танка «следаваў у жыцці, прытрымліваючыся яго», наш зямляк. Гэта вынікае з лістоў падпалкоўніка дзяржаўнай бяспекі — у гэтым званні Мікалай Мікалаевіч Калінковіч служыў у Грузіі — да тагачаснага старшыні Саюза пісьменнікаў Беларусі. Два з іх надрукаваны на машынцы, адзін — рукапісны. І няхай пішучая машынка не мела асобных беларускіх літар, гэта не перашкаджала аўтару звяртацца да славутага паэта на роднай для абодвух творцаў мове.**



*Максім Танк.*

«20 мая 1989 г., Тбілісі. Добры дзень, шаноўны Яўген Іванавіч!

Прабачце, калі ласка, перш за ўсё мяне за турботы. Звяртаюся да Вас вось па якой справе.

Праходзячы афіцэрскую службу ў Туркменіі (1979—1984 гг.), пазнаёміўся і падтрымліваў самыя цёплыя адносіны з найдабрэйшым і шчырэйшым чалавекам і шахірам Керымам Курбаннепесавым. Ён часта ўспамінаў і Вас, расказваў пра сустрэчу ў Цюмені, паказваў Вашы кнігі, прасіў мяне прачытаць вершы Вашы і на беларускай мове. Ён дазволіў у свой час занатаваць Вашы аўтографы, а таксама іншых пісьменнікаў з кніжак, якія былі падараваны Керыму-агу.

Па просьбе ашхабадскіх таварышаў я працую над успамінамі пра Керыма. 18.Х.1989 г. яму будзе 60 гадоў!

Але ж для завяршэння "ўспамінаў" мне "нечага не стае". Таму і вельмі прашу Вас, паважаны Яўген Іванавіч, адказаць на некалькі маіх пытанняў:

1. Калі і пры якіх абставінах адбылося Ваша знаёмства з Керымам? Ваша першае ўражанне аб ім?
2. Калі і дзе яшчэ даводзілася сустракацца з ім?
3. Што Вам у ім падабалася як у чалавеку?
4. Якая, на Ваш погляд, самая "моцная" рыса творчасці, паэзіі Керыма?
5. Якія Вашы вершы ён пераклаў на туркменскую мову?
6. Якое месца, на Ваш погляд, займае творчасць Керыма-агі сярод творчасці вядомых пісьменнікаў краіны?
7. Якія кніжкі падараваў Вам Керымага? Ці не маглі б Вы прывесці тэксты яго аўтографаў?
8. Ці сустракаліся вы ў Мінску?

Прыхільнікам Вашай творчасці, Яўген Іванавіч, з'яўляюся даўно. Ды што там прыхільнікам… А зараз па-новаму вывучаю і Вашы творы. Тут і ўплыў Керымаагі. Быў бы Вам вельмі ўдзячны і за якую кнігу Вашых твораў з аўтографам (усе яны каштоўныя для мяне), асобныя з іх маю і тут, у Грузіі, дзе працягваю службу і адначасова займаюся і літаратурнай працай.

Вельмі чакаю ад Вас адказу, шаноўны Яўген Іванавіч! Зычу Вам усяго найлепшага. Галоўнае ж — здароўя і плёну. Са шчырай павагай да Вас і да Вашай творчасці — Мікола Калінковіч.

Мой службовы адрас: 380119 г. Тбилиси, в/ч 51143, мне; мой хатні адрас: 380102 г. Тбилиси, Глданский массив, 6 микрорайон, 17 корп., кв. 55, Николаю Николаевичу Калинковичу.

Прабачце, калі ласка, яшчэ раз за непакойства».

* * *

«16 чэрвеня 1989 г., Тбілісі. Добры дзень, найшаноўны Яўген Іванавіч!

Сардэчна дзякую Вам за ліст, які атрымаў у пачатку месяца, але знайшоў час адказаць толькі сёння. Вядома, вельмі і вельмі спадзяюся, што ў Вас знойдуцца магчымасць, час і сілы крышачку сказаць пра Керыма Курбаннепесава, прывесці тэксты аўтографаў з яго кніг, якія ў Вас ёсць.

Тут, у Тбілісі, у мяне ёсць вашы асобныя творы. І часта я іх перачытваю, прапрацоўваю, аналізую. На жаль, чамусьці здарылася так, што з Вашага збору твораў у мяне тут ёсць толькі першыя чатыры тамы, а ў іх, вядома, няма перакладаў, у тым ліку і твораў Керыма Курбаннепесава.

Ці знаёмы, Яўген Іванавіч, Вы з перакладамі Міколы Аўрамчыка — пяць вершаў Керыма, у тым ліку "Тры выпадкі з жыцця Кемінэ"?

Са свайго боку мне хацелася б падрыхтаваць да 60-годдзя Керыма (18.Х, сёлета) артыкул для "ЛіМа" альбо яшчэ якога беларускага друкаванага органа. Гэта быў сапраўды шчыры друг нашай рэспублікі, сапраўдны чалавек і шахір.

Ці не маглі б, Яўген Іванавіч, Вы сказаць колькі слоў пра сустрэчы і размовы з Керымам на VIII з'ездзе пісьменнікаў СССР у чэрвені 1986 г. у Маскве? Там з высокае трыбуны выступалі і Вы, выступаў і Керым...

Прабачце, калі ласка, за магчымую надакучлівасць, але яна ў дадзеным выпадку выклікана маім аб'ектыўным інтарэсам да таго, што зыходзіць з глыбінь душы і сэрца.

З вялікай павагай і шчырасцю да Вас, з чаканнем адказу

Мікола Калінковіч. Да пабачэння».

* * *

«1.ХІ.1989 г., Тбілісі. Добры дзень, шаноўны і дарагі Яўген Іванавіч!

Перш за ўсё віншую Вас са Святам Кастрычніка! Жадаю моцнага здароўя, плёну, поспехаў ва ўсіх справах і галоўнае ж — каб не маўчала Ваша ліра, а працягвала кранаць сэрцы людзей, абуджаць іх найлепшыя пачуцці.

Ліст Ваш пра Керыма-агу атрымаў яшчэ ўлетку. Вялікае, вялікае дзякуй Вам. І прабачце мяне, калі ласка, Яўген Іванавіч, што своечасова не падзякаваў Вас за гэта.

Так, 18.Х Керыму было б 60. Толькі 60. Гэтая падзея прайшла неяк незаўважана. Нагадалі толькі ў Туркменіі. Мой артыкул з перакладамі некалькіх вершаў Керыма "Шчыры друг Беларусі" "ЛіМ" адхіліў. У. Ягоўдзік паведаміў, што, маўляў, сваіх юбіляраў не адзначаем, а то яшчэ там з суседніх рэспублік… Што тут гаварыць?! Шкада, дый годзе. Шкадую, што падрыхтаваў толькі ў "ЛіМ". На мой погляд, гэты матэрыял ніколі не пастарэе. Але як, Яўген Іванавіч, паўздзейнічаць на іх? Даруйце, што пішу пра гэта, — карціць на душы.

Сачу за перыёдыкай Беларусі, за Вашай творчасцю. З задавальненнем прачытаў Вашы новыя творы ў "Полымі" (1989, № 9). Занатаваў для сябе "Якім нарадзіўся". Блізка, істотна, праўдзіва.

*Колькі было розных*
*За мой век дарадцаў,*
*Іхніх аргументаў,*
*Довадаў і рацый…*

"Якім нарадзіўся, такім мяне ешце". Гэтаму Вашаму прынцыпу следую ў жыцці, прытрымліваючыся яго…

Калі ў Вас будзе час, шаноўны Яўген Іванавіч, я прасіў бы адказаць толькі на гэтыя пытанні:



*Мікола Калінковіч.*

1. Ці назіраеце Вы зараз за туркменскай паэзіяй, літаратурай? Хто, на Ваш погляд, у Туркменіі "роўны" з Керымам (таксама ў братніх рэспубліках)?
2. З кім з прадстаўнікоў братніх літаратур падтрымліваеце шчырыя, творчыя кантакты?..

Жадаю Вам усяго добрага! Са шчырым прывітаннем і вялікай зямной павагай Мікола Калінковіч».

* * *

З выяўленых у Беларускім дзяржаўным архіве-музеі літаратуры і мастацтва лістоў нашага земляка вынікае, што Максім Танк даваў адказы чэкіступісьменніку. Але яго ўдава Святлана Паўлаўна Калінковіч паведаміла, што сярод шматлікіх архіўных матэрыялаў мужа, якія сям'я захавала пры вяртанні з Грузіі ў Беларусь, аўтографаў народнага пісьменніка не сустракала…

**Таццяна КАНАПАЦКАЯ**

# Архіепіскап са Скорыч

**У лістападзе 1911 года на Карэліччыне, у вёсцы Скорычы, нарадзіўся епіскап Рускай праваслаўнай царквы, архіепіскап Кіравагградскі і Нікалаеўскі Багалеп (Міхаіл Раманавіч Анцух).**

Лёсы праваслаўных святароў, нягледзячы на іх высокае служэнне, даволі часта застаюцца для сучаснікаў і тым болей наступных пакаленняў невядомымі. Вось і з біяграфіі нашага земляка няшмат вядома.

Жыў і вучыўся Міхаіл пад панскай Польшчай. У 1925 годзе закончыў сямігодку ў Ярэмічах. Турэц, Ярэмічы, Загор'е — мясціны, звязаныя з багатым пісьменніцкім асяроддзем. Адсюль, з навакольных паселішчаў, — народны пісьменнік Беларусі Янка Брыль, літаратуразнаўца Уладзімір Калеснік, празаік Яўген Крамко, дзіцячы пісьменнік Мікола Бусько, паэт Пятро Ламан… Пра іх шмат што вядома землякам. Згадваюць пісьменнікаў у мясцовых школах, краязнаўчым музеі, у раённай бібліятэцы. А ці памятаюць архіепіскапа Багалепа?..

Да 1934 года Міхаіл жыў з бацькамі. А ў лютым гэтага года паступіў паслушнікам у Жыровіцкі Успенскі манастыр. У 1936 годзе прыняў манаскі пострыг. Малады чалавек атрымаў імя Багалеп. 20 мая 1934 года быў рукапаложаны ў сан іерадыякана, а ў кастрычніку 1939-га — у сан іераманаха. І з прыходам вызваліцеляў ад польскага прыгнёту, усталяваннем савецкай улады, і ў вайну іераманах Багалеп заставаўся ў Жыровічах.

А ў ліпені 1943 года Мінскім мітрапалітам Панцеляймонам узведзены ў сан ігумена і прызначаны намеснікам Жыровіцкага манастыра. Праваслаўная царква і пад акупацыяй немцаў перажывала нялёгкія часіны. Мітрапаліта Панцеляймона ў маі 1942 года адхілялі ад кіраўніцтва Беларускай царквой, высылалі ў Лядзенскі



*Архіепіскап Багалеп.*

манастыр. Пасля — у красавіку 1943 года — вярнулі ў Мінск.

У кастрычніку 1947 года ігумена Багалепа перавялі на пасаду настаяцеля прыходскага храма ў мястэчку Крошын, што непадалёк ад Баранавіч. У 1948-м наш зямляк паступіў у Ленінградскую духоўную семінарыю. Закончыўшы яе, працягнуў завочна вучобу ў Ленінградскай духоўнай акадэміі. З чэрвеня 1950 года нёс службу ў храме ў Добрушы. У 1954-м перайшоў у Бранскую епархію, у храм Пятра і Паўла ў горадзе Клінцы.

1 студзеня 1959 года ў біяграфіі Багалепа — новы адрас: яго прызначаюць настаяцелем Балцкага Феадосьеўскага манастыра Адэскай епархіі. У жніўні епіскап Багалеп узведзены ў сан архімандрыта. А 9 лістапада 1963 года святар, якому мінула 50 гадоў, хіратанісаваны ў епіскапа Мукачаўскага і Ужгарадскага. Хіратонію ў Троіца-Сергіевай лаўры ажыццявілі Патрыярх Алексій І, мітрапаліт Круціцкі і Каломенскі Пімен (Ізвекаў), мітрапаліт Ленінградскі і Ладажскі Нікадзім (Ротаў), архіепіскап Яраслаўскі і Растоўскі Леанід (Палякоў), епіскап Кастрамскі і Галіцкі Нікадзім (Руснак), епіскап Валакаламскі Піцірым (Нячаеў). Высокі аўтарытэт мела кожная з гэтых асоб. Былі ў іх біяграфіі і ўздзел у Вялікай Айчыннай вайне, і пакуты ў сталінскім ГУЛАГу…

З мая 1965 года наш зямляк — епіскап Кіравагградскі і Нікалаеўскі. 9 верасня 1974-га ўзведзены ў сан архіепіскапа ўказам Патрыярха Пімена. Дарэчы, вось як характарызавала кіраўніцтва ўрада Украіны (у прыватнасці ўпаўнаважаны па справах рэлігій) архіепіскапа Багалепа: «…належыць да ліку найбольш рэакцыйных і фанатычна праваючых архіерэяў», «далейшае знаходжанне Багалепа ў якасці епархіяльнага архіерэя надзвычай непажадана».

У кастрычніку 1977-га архіепіскапа адправілі на пакой. А 13 мая 1978 года завяршылася яго зямное жыццё. Пахаваны Багалеп на могілках Успенскага мужчынскага манастыра ў Адэсе.

Такі вось шлях прайшоў ураджэнец Карэліцкага раёна Міхаіл Анцух. І калі ў Беларусі будзе складзена карта праваслаўнага краязнаўства, то, відавочна, знойдзецца ў ёй месца і адрасам, звязаным з лёсам гэтага руплівага, шчырага святара.

**Мікола МІРШЧЫНА**

# Простыя рэчы

## «Спраўдзілася адна мара — пераходзь да наступнай»

**Адна з самых знакамітых айчынных журналістак, аўтар папулярных кніг прыйшла ў прафесію праз хобі. Інеса Плескачэўская распавядае, якім чынам дзіцячае захапленне дапамагло рэалізаваць галоўныя якасці характару і знайсці сваё пакліканне.**

**— Інеса Мікалаеўна, вы скончылі філасофскі факультэт БДУ, але працуеце ў журналістыцы. Раскажыце, як складваўся ваш творчы лёс.**

— Лічу, што чалавек зусім не абавязкова павінен працаваць па спецыяльнасці. Слынны сатырык Міхаіл Жванецкі распавядаў, як казалі яму бацькі: «Спачатку стань інжынерам, а потым вырашай, кім будзеш». Тут прыкладна тое самае. Калі ў дзяцінстве ў мяне пыталіся, кім я мару стаць, я адказвала, што пісьменнікам. Але мама лічыла, што гэта зусім не сціпла — трэба адказваць: «журналістам». У школьных сачыненнях так і стала пісаць, хоць і асабліва да таго не імкнулася.

Паступіла на філасофскі факультэт, падавалася, гэта так прыгожа гучыць — філасофія! І атрымала ўніверсальную адукацыю, якая дазваляе быць кім заўгодна, бо ў працэсе навучання закладваюцца пэўныя асновы, уменне мысліць, прытым лагічна, а нас вучылі яшчэ і крытычна. А гэта якраз і ёсць адна з найважнейшых якасцей журналіста. Як і здольнасць выкарыстоўваць розныя крыніцы інфармацыі. Калі скончыла навучанне з чырвоным дыпломам, ніводнага дня па спецыяльнасці не працавала. Уладкавалася ў Міністэрства замежных спраў. Але пісаць пачала, калі яшчэ была студэнткай. Першы мой допіс выйшаў у «Вячэрнім Мінску» і называўся



*Інеса Плескачэўская.*

«Танец, напоўнены сэнсам» — такім чынам, у журналістыку я прыйшла больш чым 30 гадоў таму праз балет! Падчас працы ў міністэрстве працягвала пісаць. Калі ж пераехала з Лондана ў Пекін, то зразумела, што настаў час ажыццявіць сваю дзіцячую мару і стаць журналістам. Мяне ўжо ведалі як аўтара. Калі тагачаснаму галоўнаму рэдактару газеты «СБ. Беларусь сегодня» Паўлу Якубовічу сказала, што хачу быць іх карэспандэнтам у Кітаі, ён пагадзіўся. Сваю першую кнігу «Паднябесная краіна» напісала праз паўтара гады пасля прыезду ў Кітай. Цяпер кніга была б іншай…

**— Давайце вернемся да балета. Калі гартаеш вашу кнігу «Феномен Валянціна Елізар'ева», што нядаўна выйшла з друку, згадваецца вобраз балерыны Ганны Паўлавай з савецкага фільма. Дзяўчынка, першы раз трапіўшы на балетнае прадстаўленне, увесь час на працягу яго стаяла і шырока расплюшчанымі вачыма глядзела на сцэну. На яе спектакль паўплываў так, што яна сама стала балерынай. Вы апісваеце свае ўражанні — адно да аднаго. Але сталі пісаць пра балет. Ці не хацелася вам танцаваць на сцэне?**

— Я занадта лянівая для таго, каб танцаваць. У дзяцінстве ў Палацы піянераў наведвала шмат секцый і даўжэй чым дзе затрымалася ў гуртку мяккай цацкі. Некалькі разоў наведала і танцавальны. З першых заняткаў мне не спадабалася, што мы не танцуем, а толькі развучваем рухі, як артысты балета каля станка. Гэта не на мой характар. Я спрынтар і люблю хуткія вынікі. А балет — доўгатэрміновая і сістэматычная каласальная работа і фізічныя нагрузкі... Таму і не марыла ніколі стаць балерынай, хаця танцаваць люблю.

**— То-бок, калі вы глядзіце на сцэну, у душы няма шкадавання: там магла быць я…**

— Нічога падобнага. Бо марыла толькі пра пісьменніцтва.

**— Перад вамі скончаная кніжка. Мара дасягнута. Ці не адчуваецца пэўнае спусташэнне, так званая кундэраўская «невыносная лёгкасць быцця»?**

— У маім выпадку гэта не лёгкасць. Але спусташэнне ёсць. Калі ўжо трымаеш кнігу ў руках, зазвычай паспеў пераадолець гэтае спусташэнне. Бо яно находзіць тады, калі кніга здаецца ў выдавецтва і ты, прачнуўшыся, разумееш, што пісаць больш не трэба. Працавала я над «Феноменам Валянціна Елізар'ева» два гады — збірала матэрыял. А ўласна пісала — каля трох месяцаў. І сапраўды, калі здала яе, спусташэнне накрыла моцнае. Гэтак з любым праектам, працу над якім завяршаеш. Мы і з Елізар'евым пра тое размаўлялі. Калі ў яго адбываецца прэм'ера, спачатку ён вельмі хвалюецца, за тры-чатыры дні да яго лепш не падыходзіць… Але праз дзень пасля паказу, а, як правіла, гэта шалёны поспех, сапраўды, накрывае магутнае спусташэнне. Няма ні фізічных, ні ментальных сіл. Ты проста выключаешся з жыцця. Але і гэта праходзіць. Галоўнае — знайсці новы праект. І лепей за ўсё, калі паспяваеш яго прыдумаць яшчэ ў працэсе працы над папярэднім. Каб не было перапынку — і спусташэнне не зацягнулася…

**— Кітайцы зазвычай не жадаюць чалавеку, каб яго мара спраўдзілася на ўсе сто — хіба напалову. Бо інакш не застанецца дзеля чаго жыць…**

— Значыць, трэба мець некалькі мар. Спраўдзілася адна — пераходзь да наступнай. Трэба марыць, мець шмат жаданняў, быць зацікаўленым і дапытлівым. Бо ў свеце ёсць многа цікавага. Не ўсё атрымаецца з таго, чаго жадаеш. Але калі ў цябе шмат жаданняў і мар, заўжды ёсць магчымасць выбраць, што канкрэтна будзеш ажыццяўляць. Трэба, каб заўжды было нешта ў запасе.

**— І над чым збіраецеся працаваць цяпер?**

— Кніга пра Елізар'ева — адзінаццатая ў мяне. Яна, як і ўсе папярэднія, нон-фікшн. Літаральна да нядаўняга часу не магла лічыць сябе пісьменнікам. Казала, што я — аўтар кніг. Але цяпер хачу напісаць раман. Падзеі будуць адбывацца ў Кітаі ў 2007—2008 гадах. Не ведаю, ці атрымаецца. Але ёсць толькі адзін спосаб даведацца…

**Гутарыла Таша ШПАКОЎСКАЯ**

**зваротная сувязь**

## Вандроўкі ў часе і прасторы

У нядзелю і чацвер увазе слухачоў канала «Культура» Беларускага радыё — праграма пісьменніка Навума Гальпяровіча «Развагі пра літаратуру». У рамках блока ранішніх праграм «У рытме дня» выходзяць праекты «Адным штрыхом» з вершамі і мініяцюрамі беларускіх аўтараў, а таксама «Ранішні серыял» са старонкамі твора Людмілы Рублеўскай «Золата забытых магіл».

Праграма «Літаратурная анталогія» прапануе «Казкі жыцця» Якуба Коласа (да 140-годдзя з дня нараджэння народнага паэта Беларусі).

У «Радыёбібліятэцы» прагучаць апошнія старонкі эпічнай паэмы Адама Міцкевіча «Пан Тадэвуш», а таксама пачатак твора Пятра Васючэнкі «12 подзвігаў Геракла».

У праекце «Літаратурныя гісторыі» ў вячэрнім эфіры выхадных слухачоў чакаюць апавяданні. Для аматараў паэзіі ў праграме «Прачулым радком» прагучаць вершы Хведара Жычкі.

Змест перадачы «Радыётэатр плюс» у суботу і нядзелю складуць дзве часткі радыёверсіі спектакля Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы «Раскіданае гняздо» паводле аднайменнай драмы класіка.

Юным прыхільнікам мастацкага вяшчання канал «Культура» прапануе ў суботу і нядзелю «Дзіцячы радыётэатр» з пастаноўкамі з фондаў. Штовечар у 21.00 — «Вячэрняя казка» для маленькіх.

Публіцыстычны суботні праект «Кнігарня» пазнаёміць з літаратурнымі падзеямі і навінкамі беларускіх выдавецтваў, а таксама са зместам свежага нумара штотыднёвіка «ЛіМ».

У нядзелю і сераду на «Культуры» ў радыёверсіі тэлеперадачы Навума Гальпяровіча «Суразмоўцы» гэтым разам — гутарка з дырэктарам Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа Ірынай Мацэс.

У праграме магчымы змены. Расклад перадач канала «Культура» даступны на сайце *www.radiokultura.by* і ў сацыяльных сетках.

**Мінскае гарадское аддзяленне Саюза пісьменнікаў Беларусі запрашае:**

**14 красавіка** — у СШ № 129 (вул. Пляханава, 51) на творчую сустрэчу з Уладзімірам Мазго (11.00).

**14 красавіка** — у Мінскі гарадскі тэатр паэзіі пры Цэнтральнай бібліятэцы імя Я. Купалы (вул. В. Харужай, 16) на творчую імпрэзу «Паэзія маладых» (17.30).

**ЛіМ Каляндар**

**9 красавіка** — 90 гадоў з дня нараджэння Уладзіміра Бойкі (1932—1996), мастацтвазнаўца, літаратурнага крытыка, графіка, паэта, кінасцэнарыста.

**9 красавіка** — 80 гадоў з дня нараджэння Тамары Паўлючук (1942—2006), мастака манументальна-дэкаратыўнага мастацтва, жывапісца.

**9 красавіка** — 75 гадоў з дня нараджэння Івана Мацкевіча (1947—2017), акцёра, заслужанага артыста Рэспублікі Беларусь.

**10 красавіка** — 115 гадоў з дня нараджэння Іосіфа Матусевіча (1907—1985), акцёра, народнага артыста БССР.

**10 красавіка** — 100 гадоў з дня нараджэння Уладзіміра Лагуна (1922—2004), жывапісца.

**11 красавіка** — 80 гадоў з дня нараджэння Пятра Шарыпы (1942—2013), жывапісца, педагога.

**12 красавіка** — 85 гадоў з дня нараджэння Яўгена Пакаташкіна (1937—1994), графіка.

**12 красавіка** 70-гадовы юбілей святкуе Уладзімір Палуэктаў, кампазітар, піяніст.

**13 красавіка** 80-годдзе адзначае Канстанцін Нікалайчук, самадзейны мастак, урач.

**14 красавіка** 60 гадоў спаўняецца Аляксандру Дулубу, жывапісцу.

**14 красавіка** 60-гадовы юбілей адзначае Ігар Еўтухоў, гісторык.

**15 красавіка** — 120 гадоў з дня нараджэння Міколы Нікановіча (1902—1944), празаіка, перакладчыка.

**Каляндар падрыхтаваны БДАМЛМ**

У № 13 «ЛіМа» на старонцы 5 у матэрыяле «Закаханы скідзень… ды іншыя цуды» дапушчана памылка — няправільна ўказаны ўзрост пераможцы конкурсу. Вікторыя Смолка нарадзілася ў 1996 годзе і з'яўляецца членам Гродзенскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі.

**Выходзіць з 1932 года**

**Заснавальнікі:**
**Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь, грамадскае аб'яднанне «Саюз пісьменнікаў Беларусі», рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом "Звязда"»**

**Галоўны рэдактар**
**Аляксей Іванавіч ЧАРОТА**

**Рэдакцыйная калегія:**
Таццяна Арлова
Алесь Бадак
Дзяніс Барсукоў
Віктар Гардзей
Уладзімір Гніламедаў
Вольга Дадзіёмава
Жана Запартыка
Анатоль Казлоў
Анатоль Крэйдзіч
Віктар Кураш
Алесь Марціновіч
Вячаслаў Нікіфараў
Мікалай Чаргінец
Іван Чарота
Іван Штэйнер

**Адрас рэдакцыі:**
**Юрыдычны адрас:**
220013, Мінск,
вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а
E-mail: info@zviazda.by

**Адрас для карэспандэнцыі:**
220034, Мінск, вул. Захарава,19
E-mail: lim_new@mail.ru
Адрас у інтэрнэце: www.zviazda.by

**Тэлефоны:**
галоўны рэдактар — 325-85-25
намеснікі галоўнага рэдактара — 319-79-85, 224-66-74
адказны сакратар — 377-99-73
аддзел крытыкі і бібліяграфіі — 317-20-98
аддзел прозы і паэзіі — 317-20-98
аддзел мастацтва — 317-20-98
бухгалтэрыя — 311-17-16

Выходзіць раз на тыдзень у пятніцу.

**Падпісныя індэксы:**
63856 — індывідуальны;
63815 — індывідуальны льготны для настаўнікаў;
638562 — ведамасны;
63880 — ведамасны льготны.

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі сродку масавай інфармацыі № 7 ад 10.12.2012, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

**Выдавец:**
Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом "Звязда"».
Дырэктар — галоўны рэдактар
Аляксандр Мікалаевіч КАРЛЮКЕВІЧ

Нумар падпісаны ў друк 07.04.2022 у 11.00
Ум. друк. арк. 3,72
Наклад — 681

**Друкарня** Рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Выдавецтва «Беларускі Дом друку»
ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004
г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 79/1. Індэкс 220013

Заказ — 985

Д 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Рукапісы прымаюцца толькі ў электронным выглядзе (праграма Microsoft Word), не вяртаюцца і не рэцэнзуюцца.
Пазіцыя рэдакцыі можа не супадаць з меркаваннямі аўтараў публікацый.
Аўтары нясуць адказнасць за факты, якія прыводзяцца у публікацыях, у адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

ISSN 0024-4686
9 770024 468001 22014